ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

Год выдання 33-і
№ 72 (1917)
8 верасня 1964 г.
АЎТОРАК
Цана 4 кап.

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

Надзённае, неадкладнае

ЭНТУЗІЯЗМ ПЛЮС ПАЛІВА

Такая ўжо асаблівасць работы сельскай культасветустановы, што самая гарачая пара ў яе, яе «прынар» пачынаецца тады, калі спадае гарачая пара ў хлебароба, калі ў яго з'яўляецца больш вольнага часу.

— Летам мы таксама не сядзелі, склаўшы рукі,— гаворыць загадчыца Несенскай сельскай бібліятэкі Лепельскага раёна Таіса Грынь.— Але работа праводзілася ў асноўным па-за сценамі бібліятэкі. Выязджалі з канцэртамі мастацкай самадзейнасці, праводзілі гутаркі і гучныя чыткі ў полі і на сенажаці... Ну, а цяпер пачынаецца наш сезон, так сказаць, на стацыянары. Трэба рыхтавацца...

І бібліятэкарка пачала меркаваць, што трэба зрабіць. Вось новых кніг атрымалі многа, трэба заказаць яшчэ адзін стэлаж. Не шкодзіла б і трохі асвяжыць сцены, папоўніць інвентар, набыць новыя настольныя гульні. Ну і, вядома, дровы, паліва... Гараджане, напэўна, і не ведаюць ужо, што гэта такое, у гарадскога бібліятэкара такой турботы няма, а для нас, для мяне асабіста...

Дзяўчына ўспамінае, як раней, калі яна толькі прымала бібліятэку, гэтыя дровы вельмі даліся ёй у знакі. Была ўжо глыбокая восень, пачыналіся халады, у новую бібліятэку ішлі першыя чытачы, вечарамі пачынала збірацца моладзь, а памяшканне не апальвалася. Не прывезлі своечасова паліва. «Хаджу, скарджуся, прашу, а мне адказваюць: не адпускаюць грошы. Я ўжо гатова была сваю зарплату пераводзіць на рахунак бібліятэкі, абы толькі былі дровы. Вось як тут усё пачыналася»...

У расказе Т. Грынь, адной з лепшых сельскіх бібліятэкарак Лепельшчыны — сённяшнія турботы ўсіх яе таварышаў па справе: работнікаў бібліятэк, клубаў, сельскіх дамоў культуры. Хто-хто, а яны, ведаюць, як залежыць іх справа ад так званай матэрыяльнай базы, як ускладняецца іх работа, калі пачынаюцца гэтыя самыя «дробныя непрыемнасці»—то пачне зацякаць столь і сыпацца з яе атынкоўка, то раптам стане ў самую сцюжу дымліць грубка, то нешта здарыцца з электраправодкай, то ў самы адказны момант выходзіць са строю радыёла і зрываецца цікавы вечар моладзі, то...

Ды ці мала гэтых «то» можа сабрацца, калі не падрыхтавацца як след да зімы, калі ў гэтай падрыхтоўцы не ўлічыць усё, да дробязей.

На дварэ ўжо восень. І большасць калег Таісы Грынь ведае, што марудзіць нельга, трэба неадкладна рыхтавацца да зімы — інакш давядзецца потым шкадаваць. І такая падрыхтоўка вядзецца. Ёй садзейнічае грамадскі агляд сельскіх культасветустаноў, які ідзе зараз у рэспубліцы.

Многія культасветустановы актыўна рыхтуюцца, а некаторыя ўжо грунтоўна падрыхтаваліся да работы ў зімовых умовах. Добра ідуць справы, напрыклад, у Шклоўскім раёне. Тут патрабавалі рамонту шаснаццаць культасветустаноў. Дванаццаць з іх поўнасцю адрамантаваны, ім уручаны пашпарты гатоўнасці да зімы.

Такія звесткі паступаюць з Хойніцкага, Рэчыцкага і некаторых іншых раёнаў.

На жаль, больш сігналаў іншага характару. У многіх раёнах падрыхтоўка культасветустаноў да зімы па сутнасці не пачалася. Не аддаюць належнай увагі гэтай справе, напрыклад, на Піншчыне. Даўно патрабуе рамонту, прытым капітальнага, Лагішчанскі пасялковы Дом культуры. Яго і пачыналі рамантаваць некалькі месяцаў назад, але потым работы спынілі. На тэрыторыі Охаўскага сельсавета—шэсць устаноў культуры і ніводнага з іх пакуль што не адрамантавана, не забяспечана палівам. Такія факты не могуць не ўстрывожыць.

Падрыхтоўка культасветустаноў да зімы — справа вялікай важнасці. Гутарка ідзе аб тым, ці змогуць сельскія клубы і бібліятэкі ў зімовы час нармальна працаваць, весці масава-палітычную і культурна-асветную работу. Мясцовыя савецкія і партыйныя органы, кіраўнікі гаспадарак павінны ясна ўсведамляць сабе гэта, павінны зрабіць усё неабходнае да таго, каб стварыць для работы культустаноў у зімовы час самыя спрыяльныя ўмовы.

Многае, вядома, залежыць і ад непасрэднага гаспадара, — ад дырэктара Дома культуры, ад загадчыка клуба, ад бібліятэкара. Асабліва, калі гутарка ідзе аб тым, каб, як кажуць, забіць у сценку цвік ці ўставіць шыбіну. Тым больш, што ў рэзерве культасветработнікаў такая вялікая сіла, як моладзь, актывісты.

Зімовы час самы спрыяльны для разгортвання культурнай работы на сяле. Гэта добра разумеюць культработнікі. І сёння яны жывуць радасным прадчуваннем, рыхтуюцца, плануюць. Планы ў іх вялікія. Але адных добрых планаў, адных добрых намераў мала. Мала аднаго энтузіязму. Для поспеху справы патрэбны яшчэ і такія «празаічныя» рэчы, як інвентар і паліва, адрамантаваная печ і пабеленыя сцены.

Словам, энтузіязм плюс паліва...

Энтузіязм плюс пашпарт гатоўнасці да зімы.

РАПАРТУЕ ЗАЛАТАЯ ВОСЕНЬ

Многа ёсць у нас добрых народных традыцый і свят. Гэта—святы рэвалюцыйнага календара, святы чалавечай радасці і рупнай працы. На Віцебшчыне традыцыйным стала свята залатой восені, свята ўраджаю. Сёлета яно адбылося тут у мінулую нядзелю, 6-га верасня.

Валянцін Лявонаў, рэдактар Лёзненскай раённай газеты, на наша пытанне аб тым, як адзначылі свята працоўныя Лёзненшчыны, расказаў:

— З самага ранку на паляне Адаменскага гаю сабраліся сотні хлебаробаў саўгаса «Адаменкі», калгасаў імя Леніна, «Бальшавік», імя Чкалава, «Іскра», імя Чапаева. У чаканні пачатку свята яны з цікавасцю знаёмяцца з экспанатамі своегасаблівай сельскагаспадарчай выстаўкі — з важкімі снопамі жыта, пшаніцы, лёну, кукурузы, са шматлікімі стэндамі і плакатамі. Мусіць яно, гэтае багацце роднай зямлі, гэты плён працы старанных чалавечых рук стварае ў людзей радасны, сапраўды святочны настрой.

Пачатак свята абвяшчаюць матацыклісты-сцяганосцы. 12 машын — 12 чырвоных палотнішчаў. Яны ўпрыгожваюць зробленую на паляне сцэну.

Праз хвіліну да сцэны пад'язджае брычка, запрэжаная тройкай коней. На ёй—сімвалічныя «Залатая восень» і «Ураджай», прадстаўнікі хлебаробаў калгаса імя Леніна. Ім, пераможцам сацыялістычнага спаборніцтва на ўборцы ўраджаю, даручаны ганаровы абавязак — прывезці на свята «Сноп багацця».

Сноп, упрыгожаны шырокай шаўковай стужкай, ставяць на сцэне на самае пачэснае месца. За ім на памост узыходзяць на чале з кіраўнікамі гаспадарак героі жніва. Ва ўсіх іх цераз плячо чырвоныя стужкі з надпісам «Слава працы».

Старшыня Лёзненскага сельскага Савета Генадзь Марціновіч у акружэнні «Залатой восені» і «Ураджаю» вітае прысутных са святам, гаворыць аб працоўных поспехах хлебаробаў. Пасля старшыні калгасаў, дырэктар саўгаса ўручаюць пераможцам спаборніцтва каштоўныя падарункі. Ганаровыя граматы лепшым хлебаробам раёна ўручае намеснік начальніка калгасна-саўгаснага ўпраўлення Генадзь Грыгор'еў.

Іграюць баяны. Жанчыны ў квяцістых нацыянальных касцюмах з песнямі падносяць старшыням калгасаў каравай з новага хлеба, надзяюць на іх вянкі з калосся і кветак. Тут жа старшыні лепшай у раёне гаспадаркі М. Быкоўскаму ўручаецца прыз залатой восені, у гонар яго чытаюцца вершы.

А пасля адбыўся вялікі канцэрт, у якім прынялі ўдзел самадзейныя артысты.

Святы ўраджаю прайшлі таксама ў Суражы, Янавічах, у Бабінавіцкім бары, у Бярозавым гаі на Яськаўшчыне і ў іншых маляўнічых мясцінах Лёзненшчыны.

Аб тым, як праходзіла свята ўраджаю ў Пастаўскім раёне, паведаміў нам рэдактар раённай газеты Павел Дзядзёнак. Ён, у прыватнасці, расказаў:

— Я быў сведкам гэтага свята ў Варапаеўскім гарадскім парку культуры. Сюды, пад выносістыя сосны, прыйшлі хлебаробы саўгасаў «Варапаева» і «Старадворскі», калгаснікі сельгасарцелі «Гігант», а таксама госці са Швенчонскага раёна Літвы, з якім спаборнічаюць працоўныя Пастаўшчыны, са Смаленшчыны і Украіны. Прадстаўнікоў братніх народаў хлебам-соллю вітала перадавая свінарка саўгаса «Варапаева» дэпутат Віцебскага абласнога Савета Лізавета Апанасаўна Князь.

Свята ўраджаю адкрыла старшыня Варапаеўскага пасялковага Савета Антаніна Данілаўна Арэхава. Яна павіншавала прысутных з дасягнутымі поспехамі ў працы, пажадала ім шчасця ў асабістым жыцці, запрасіла перадавікоў і гасцей на сцэну, за ганаровы стол.

Па баках сцэны ўстаноўлены вазы багацця, напоўненыя пладамі ўраджаю гэтага года. А ўраджай сёлета працаўнікі вёскі вырасцілі добры.

На свяце ўраджаю выступіў начальнік калгасна-саўгаснага ўпраўлення Аляксей Федарэнка, які ўручыў пасведчанні на права ўдзелу ў Выстаўцы дасягненняў народнай гаспадаркі СССР саўгасу «Варапаева» і калгасу «Кастрычнік», а таксама многім перадавікам сельскагаспадарчай вытворчасці.

Аздаблялі свята сімвалічныя «Залатая восень» і «Ураджай». Быў на свяце і жаданы госць — каравай з новага ўраджаю.

Закончылася свята канцэртам, у якім выступілі ўдзельнікі мастацкай самадзейнасці.

Святы-рапарты залатой восені прайшлі па ўсёй Віцебшчыне.

У САЮЗЕ ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

Учора на пасяджэнні прэзідыума праўлення Саюза пісьменнікаў БССР адбылося вылучэнне твораў на атрыманне Ленінскіх прэмій. Вылучаны «Новая кніга» Аркадзя Куляшова, зборнік вершаў Максіма Танка «Хлеб мой надзённы» і раман Івана Шамякіна «Сэрца на далоні».

Прэзідыум разгледзеў таксама пытанні аб падрыхтоўцы і правядзенні 150-годдзя з дня нараджэння вялікага рускага паэта Міхаіла Юр'евіча Лермантава, 60-годдзя з дня нараджэння Мікалая Астроўскага і 100-годдзя з дня нараджэння М. Кацюбінскага.

Прэзідыум абмеркаваў таксама ход дыскусіі аб сучасным беларускім рамане, якая зараз вядзецца на старонках газеты «Літаратура і мастацтва», і іншыя пытанні.

ВІНШУЕМ З УЗНАГАРОДАЙ

За заслугі ў развіцці савецкай культуры і ў сувязі з пяцідзесяцігоддзем з дня нараджэння Прэзідыум Вярхоўнага Савета БССР узнагародзіў міністра культуры Беларускай ССР тав. Мінковіча Міхаіла Аляксандравіча Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР.

Дыскусіі. На парадку дня: раман

Міхась СТРАЛЬЦОЎ:

І ПАЙШОЎ ДАРОГАЙ РОСТУ...

1. ПЕРШ чым пра раман, два словы пра апавяданне. Так, так, пра тое апавяданне, пра якое цяпер кажуць, што яно ў параўнанні з раманам недаравальна адстае, наогул змізарнела на фоне ледзь не самага сапраўднага росквіту эпікі. Колькі гадоў назад перажывала лепшую сваю пару, а цяпер...

Сёння і сапраўды цяжка гаварыць пра росквіт апавядання. Мусіць, усё ж яно адстае, мусіць, саступіла месца раману. Непрыемна гэта? Вядома. Але ж што рабіць? Мімаходзь папракаць апавядальнікаў, адначасова расхвальваючы раманістаў? А калі заўтра апавяданне вырвецца наперад, што тады? Усё наадварот: грунтоўна хваліць апавядальнікаў і мімаходзь папракаць раманістаў? Не, тут нешта не так. Мы не павінны тут пераймаць норавы тых балельшчыкаў, што гатовы на руках насіць іграка, калі ён бліскуча забівае гол, а другім разам гатовы палічыць у таго ж іграка рэбры, калі ён свой мяч пасылае міма варот. І ў літаратуры, вядома, не павінна ўсё абыходзіцца без страсці, але больш за ўсё тут патрэбна разважлівасць. Адстае апавяданне... Чаму? Чаму некалькі год назад у нас амаль не было раманаў? Ці не абавязаны мы ў нейкай ступені поспехамі сённяшняга рамана ўсё таму ж апавяданню? Многа «чаму». Тут варта і трэба паразважаць. Спакойна, грунтоўна, па-гаспадарску. Мы дрэнна яшчэ, вельмі дрэнна ўлічваем, а то і не ўлічваем зусім псіхалогію літаратурнага жыцця, патрабаванні да літаратуры выстаўляем часам вельмі адвольна, апрыёрна, не трымаем руку на пульсе літаратурнага працэсу і таму ўмеем у лепшым выпадку заўважыць цікавую творчую з'яву, але не даходзім яшчэ да таго, каб як след растлумачыць яе.

Так было, напрыклад, з раманам Івана Мележа—першай ластаўкай прыкметнага ажыўлення ў буйным празаічным жанры.

2. З'ЯЎЛЕННЕ рамана І. Мележа стала сапраўднай літаратурнай падзеяй: поспех твора, яго папулярнасць былі па-небываламу пераканаўчыя і відавочныя. На прызнанні высокіх мастацкіх вартасцей рамана сышліся, як ні дзіўна, і тыя, хто ўжо з недаверам сустракаў чарговыя палотны аматараў прайсціся басаном па сакаўных лугах патрыярхальшчыны, і тыя, хто з недаверам глядзеў на першых, якія нібыта ўсё «мудруюць» і ці не замахваюцца нават на аўтарытэты Купалы і Коласа.

Як жа паводзіла сябе тым часам крытыка? Яна, як і чытачы, таксама не абышла ўвагай раман. Бадай, ні пра адзін сучасны празаічны твор не было напісана столькі артыкулаў, як пра гэты мележаўскі раман. Даследавана літаральна ўсё: галоўныя і другарадныя персанажы, мясцовы каларыт, ужыванне аўтарам дыялектных слоў, перабраны, дэталёва прааналізаваны ўсе магчымыя матывы, паводле якіх Ганна магла выйсці замуж за кулацкага сына Яўхіма Карча, і... усё ж не сказана пакуль нешта галоўнае, не вытлумачаны пасапраўднаму поспех рамана, не пастаўлены ў сувязь з надзённымі праблемамі развіцця прозы.

Зразумела, што кожны чытае твор па-свойму, знаходзіць у першую чаргу ў ім тое, што яму бліжэй. Але факт, што раман «Людзі на балоце» ў нечым істотным задаволіў людзей розных густаў, розных эстэтычных прынцыпаў, сам па сабе не толькі паказальны, цікавы, але і выключны. Нейкім чынам ён сведчыць і пра выключнасць твора, які вырас на глебе ўжо знаёмага літаратуры, асвоенага ёй і з'явіўся як бы сінтэзам, падагульненнем вопыту папярэднікаў. І вось адны цэняць раман І. Мележа менавіта за гэтую яркасць, насычанасць мастацкага сінтэзу, другія за тое, што, маўляў, у ім усё зразумела, проста і нават сама форма такая, якую вынайшлі яшчэ ў добрыя старыя часы. Пішыце, маўляў, так, як пісалі раней, як піша сёння Мележ,—і ўсё будзе добра.

Нам жа здаецца недастатковым такое хуткае і занадта простае вырашэнне ўсіх праблем, усіх нядаўніх спрэчак аб шляхах развіцця сучаснай прозы. Не падабаецца нам імкненне бачыць раман І. Мележа толькі ва ўчарашнім дні. Мы згодны, што раман гэты традыцыйны. Але традыцыйны ў лепшым значэнні гэтага слова, дадаём мы, бо не абмяжоўваецца традыцыяй, а развівае, уздымае яе на новую ступень, а ў дачыненні да жыццёвага матэрыялу, тэмы пэўным чынам і вычэрпвае яе. Парадокс? Не. Кожны па-сапраўднаму таленавіты твор вучыць не толькі таму, як трэба пісаць, але і таму, як не трэба. Вучыся ў выдатнага пісьменніка яго майстэрству, яго глыбіні ў адлюстраванні жыцця, але і вучыся, абавязкова вучыся быць самім сабой, шукай у непадобнасці падобнасць.

Цяпер, каб ісці за І. Мележам, трэба мець не толькі талент, роўны ягонаму, але і нешта большае—сваю мастацкую канцэпцыю, якая б была роўназначная па сіле сінтэзу канцэпцыі Мележа, хоць, магчыма, і супрацьлеглая ёй. Плённасць шляху, па якім ішоў у сваіх пошуках І. Мележ, не выключае магчымасці ў прозе іншых шляхоў. Мастацкі «культ» небяспечны і шкодны не менш, чым усякі іншы.

Вось з'явіўся раман Янкі Брыля «Птушкі і гнёзды». Зыходзячы з якіх крытэрыяў, з якіх мастацкіх патрабаванняў яго ацаніць? Крытык, які лічыць паэтыку, стылявы і жанравы лад мележаўскага рамана адзіна прыймальнымі і адзіна плённымі, паглядзіць на твор Я. Брыля як на нейкае недаравальнае парушэнне літаратурных канонаў і норм. У лепшым выпадку ён ухіліцца ад ацэнкі рамана або вынесе яму безапеляцыйны і строгі прысуд. І сапраўды, дзе ў рамане Брыля гэта ўласцівае Мележу нетаропкае, але строга лагічнае развіццё сюжэта, дзе разгорнутыя чалавечыя характары з разгорнутымі псіхалагічнымі матывіроўкамі іх, дзе грунтоўна выпісаныя пейзажы?.. І сапраўды, дзе? Але, у сваю чаргу, дзе ў рамане І. Мележа гэты напружаны, філасафічна-лірычны роздум над жыццём, які падпарадкоўвае сабе і лад фразы, надзвычай складаны і гнуткай, і кампазіцыю, і лёс мноства людзей, узятых у самых разнастайных жыццёвых і геаграфічных акалічнасцях, дзе ў мележаўскім рамане гэтая грандыёзнасць жыццёвага мора, якое, здаецца, не мае берагоў і якое ў стане ўтрымаць толькі хіба сіла аўтарскай усепраніклівасці? Здаецца, няма ўсяго гэтага ў мележаўскім рамане. Дык, значыць, ён слабы?

Не, так нічога не дакажаш.

Думка, што пра мастака трэба меркаваць па законах, ім самім выбраных, калі і можа выклікаць пярэчанні, дык толькі ў тым выпадку, калі надаваць ёй занадта абстрактны, дагматычны сэнс. Па-першае, маецца на ўвазе мастак, г. зн. сапраўдны пісьменнік, а не халодны закройшчык літаратуры. Па-другое, кожны таленавіты мастак сапраўды непаўторны, індывідуальны і даследуе жыццё па-свойму. Але гэта не азначае, вядома, што, прызнаючы такое права мастака, мы прызнаём свабоду вузкага суб'ектывізму, калі мерай усяго з'яўляецца толькі «я» мастака. На самай справе ў літаратурным працэсе нават індывідуальнае падключаецца да агульнага, характарызуецца ім і ў сваю чаргу характарызуе яго.

У рамане Я. Брыля няма эпічна разгорнутых характараў? Але чаму яны абавязкова павінны быць? Брыль скарыстоўвае ў рамане вопыт навеліста? А навошта яму адмаўляцца ад яго? Наадварот, толькі праца пісьменніка ў жанры навелы, прынцып «лакальнага» даследавання жыцця, пры якім гэта «лакальнае» ўсё ж суадносіцца з вышэйшым, аўтарскім разуменнем жыцця (славуты брылёўскі лірызм) — такі прынцып надаў раману не толькі своеасаблівую кампазіцыйную будову, але і дазволіў стварыць тыя «міры» светапогляду, духоўнага росту Алеся Руневіча, якія, нібы канцэнтрычныя кругі, упісваюцца ў вялізную раму часу і жыцця.

Жанравая арыгінальнасць рамана Я. Брыля не выклікае сумненняў, яна відавочная. Крытык Ул. Калеснік свой артыкул, прысвечаны аналізу гэтага твора пісьменніка, назваў «раман-паэма». Вызначаючы так жанр твора, ён, наколькі гэта можна зразумець, зыходзіць з таго, што аўтар не цураецца ў прозе сродкаў паэтычнага пазнання рэчаіснасці. Усё гэта, вядома, так, але ў той жа час наўрад ці дастаткова гэтага, каб назваць раман паэмай, нават праз дэфіс.

Сам па сабе прыгадваецца факт, калі Гогаль назваў «Мёртвыя душы» — гэты своеасаблівы панаптыкум маральных пачвар — паэмай. Чым ён пры гэтым кіраваўся? Варта адразу сказаць, што такое азначэнне траціць усялякі сэнс, калі яго суадносіць толькі з першай кнігай рамана, а не мець на ўвазе ўсю аўтарскую задуму, з якой вынікала, што ў рамане павінны былі быць дзве, а можа і тры кнігі. Нібы папярэджваючы непаразуменні, Гогаль сам неаднойчы казаў, што такія фрагменты твора, як патэтычнае слова пра Русь-тройку і інш., могуць здацца недарэчнымі ў першай кнізе, але толькі тым, хто не зразумеў, не ведае аўтарскай задумы. Паэма, аказваецца, мела яшчэ другі, ідэальны план, і Русь, такім чынам, павінна была паўстаць у творы ва ўсёй сваёй сіле і слабасці, у апафеозе сваёй вялікай будучыні. Ці не гэтая няздзейсненая задума Гогаля натхняла Някрасава пры стварэнні паэмы «Каму на Русі жыць добра»?

Як бачым, Гогаль надаваў слову «паэма» не зусім жанравае значэнне, ён падкрэсліваў у першую чаргу высокі лад сваёй задумы.

Што ж датычыць Я. Брыля, дык ён не пісаў ні строга вытрыманы ў класічных традыцыях раман, ні тым больш раман-паэму (што гэта за гібрыд?). Ён сам, апярэджваючы крытыкаў, вызначае своеасаблівасць твора так: «Кніга адной маладосці». Будзем жа прыслухоўвацца да аўтара, будзем старацца спачатку зразумець яго задуму, а пасля ўжо вяршыць свой суд.

Так, гэта «Кніга адной маладосці»: яе біяграфія, яе дзённік, яе непагасная памяць. Гісторыя выспявання маладой душы, пазнання Радзімы праз сябе і сябе праз Радзіму. Гэта кніга «пра час і пра сябе». Роздум пра ўчарашні і сённяшні дзень. І кнігу гэтую трэба прымаць такой, якая яна ёсць. Спрачацца з аўтарам — згаджацца ці абвяргаць, але і шанаваць ягоную думку, шчырасць яго пачуцця.

3. НАКОЛЬКІ ўсё ж сур'ёзна можна гаварыць пра ўплыў апавядання на раман? Калі, скажам, пры разглядзе рамана «Птушкі і гнёзды» немагчыма абысці Брыля-апавядальніка, дык якое гэта мае дачыненне да Мележа і іншых раманістаў? Нам здаецца, пастаноўка пытання мае сэнс, і даволі істотны, але пры ўмове, калі поспехам рамана сапраўды папярэднічалі пэўныя дасягненні прозы ў жанры апавядання.

Такія дасягненні былі, што адзначала ў свой час крытыка. Ажыўленне ў жанры апавядання супала з тымі дабратворнымі зменамі ў жыцці нашага грамадства, якія адбыліся пасля гістарычных XX і XXII з'ездаў Камуністычнай партыі. Літаратура як ніколі блізка падступалася да жыцця: узнаўляліся, мацаваліся сувязі з жывой рэчаіснасцю, аслабленыя ці зусім абарваныя ў гады культу асобы. Літаратурны працэс набываў натуральнасць, пачаў выразней выяўляцца ў заканамернасцях. І тут разведчыкамі новага выступілі апавядальнікі. Лепшыя з іх, такія, як Я. Брыль, А. Кулакоўскі, І. Навуменка, Я. Скрыган, маладзейшыя В. Адамчык, І. Пташнікаў, Б. Сачанка, Ул. Дамашэвіч, І. Чыгрынаў, даволі паспяхова асвойвалі, па-мастацку трансфармавалі новы змест жыцця, адначасова смела ламаючы закаранелыя мастацкія шаблоны, тую гладкую адностайнасць пісьма, якая была ледзь не нормай. Прыкметная цяга да маральнай праблематыкі і ў выніку грунтоўнае даследаванне псіхалогіі чалавека, сур'ёзныя стылявыя пошукі, новы падыход да тэмы вайны і зноў жа зварот праз яе да самага істотнага ў чалавеку, высокае майстэрства—вось той вопыт, які быў здабыты апавядальнікамі і які неўзабаве саслужыў такую добрую службу раману. Іншая справа, што гэты вопыт выкарыстаны быў раманістамі не пры асваенні тэм, непасрэдна звязаных з сучаснасцю, а пераважна на матэрыяле вайны і недалёкага мінулага. Выключэнне складае хіба што ў многім цікавы раман І. Шамякіна «Сэрца на далоні». Мусіць, гэта можна растлумачыць тым, што, па-першае, у якасці раманістаў выступілі празаікі старэйшага і сярэдняга пакалення, па-другое, сваю ролю адыграла тут і наяўнасць тых белых плям, што паявіліся на літаратурнай карце ў перыяд культу асобы. Трэба было ўзнавіць непарыўнасць літаратурнага працэсу; каб ісці наперад, трэба было вярнуцца назад. Акрамя раманаў І. Мележа і Я. Брыля, паявіліся «Сасна пры дарозе» І. Навуменкі, «Сустрэчы наростанях» А. Кулакоўскага, «Засценак Малінаўка» А. Чарнышэвіча, «Серадзібор» П. Пестрака, «На парозе будучыні» М. Лобана. Лепшыя з гэтых твораў вылучаюцца высокімі мастацкімі вартасцямі, сур'ёзным даследаваннем жыцця, дакладнасцю ўзнаўлення характараў і падзей, адлюстраваннем іх у адпаведнасці з праўдай часу.

Цяпер увесь наш клопат павінен быць аддадзены сучаснасці.

Мы далёкія ад думкі, што літаратуру можна рабіць па плану, што ўсё залежыць толькі ад нашых жаданняў. Вырашылі, напрыклад, паднаціснуць на сучасную тэму ў прозе, дружна ўзяліся, ліквідавалі прарыў і ў чарговым парадку пачалі выпраўляць становішча ў драматургіі.

Аматараў літаратурнай штурмаўшчыны хапае і без таго: яны абнародавалі ўжо сваё разуменне сучаснасці, жывавілам узятае з учарашніх і сённяшніх газет, некаторыя з іх твораў памяркоўнымі крытыкамі нават былі названы «ўкладам у літаратуру», але ніхто чамусьці не адважыўся па-чалавечы назваць іх таленавітымі. Дзякуй і за гэта.

«Як жа вы ўсё ж мяркуеце падступіцца да сучаснасці?»—можа запытаць чытач. Не ведаем, далібог, не ведаем: тут яшчэ трэба падумаць. Можна было б, вядома, яшчэ раз прысарамаціць пісьменнікаў цёплымі гарадскімі кватэрамі, якія замянілі сабой у адпаведнасці з часам вежы са слановай косці, але гэта былі б толькі словы, хоць, магчыма, у нечым і правільныя.

А можа, варта пачынаць з самага простага, з вызначэння таго, якая сучаснасць нам трэба ў літаратуры і якія творы пра яе? Ці нам трэба сур'ёзная, сапраўдная, высокамастацкая літаратура, якая выказвала б сабой усю складанасць жыцця, не баялася б ні слова высокага, урачыстага пра нашага савецкага чалавека, ні слова спапяляючага і гнеўнага пра таго, хто варты яго, ці нам трэба халодны, добрасумленны пераказ вядомых ісцін, памножаны на такое-сякое літаратурнае ўмельства, ілюстрацыі і схемы, якія не ў стане ажывіць нават старанна разлічаны аўтарскі пафас?

Так, нам патрэбна літаратура сапраўдная, высокаідэйная і высокамастацкая — толькі такая літаратура патрэбна нашаму народу, нашаму чытачу.

Дык чаму ж тады здараецца так, што крытыка, гаворачы, напрыклад, пра раман Мележа, прасочвае і сувязь твора з ранейшай мастацкай традыцыяй, і падрабязна аналізуе яго мастацкія сродкі, словам, гаворыць пра літаратуру як пра мастацт-

(Заканчэнне на 2-й стар.).

МАЛАДЗЕЧАНСКІ СЕМІНАР

Неспакойныя жыхары пасяліліся ў маладзечанскай гасцініцы. Трохпавярховы асабняк нібы ўскіпеў ад іх песень.

— От народ, — скардзіцца дзяжурная.—Заступала на дзяжурства—пяюць, здзю—пяюць. Не спяваць жа іх у камандзіроўку прыслалі?

У дзяжурнай робяцца круглыя вочы, калі я гавару, што яны якраз па песні ў камандзіроўку і прыехалі.

— Цётка Галіна, — чуецца тым часам з калідора, — хадземце да нас песні спяваць.

Цётка Галіна толькі пляскае рукамі.

Назаўтра я сустракаю сваіх знаёмых у Доме народнай творчасці. Вясёлыя мае суседзі па гасцініцы з'ехаліся ў Маладзечна на семінар грамадскіх кіраўнікоў харавых калектываў.

Магчыма, вы ўжо задумваліся, чытач, над тым, як нераўнамерна расце ў нас самадзейнасць. На аглядах мы бачым амаль прафесіянальныя калектывы, і ў той жа час многія самадзейныя артысты пакінуты самі на сябе, пяюць і танцуюць «што бог на душу паклаў», ніяк не ўдасканальваюць сваё майстэрства. Прафесіянальных кіраўнікоў для ўсіх калектываў, вядома, не хапае, але ж культурны ўзровень саміх удзельнікаў самадзейнасці цяпер такі, што многія з іх пасля адпаведнай падрыхтоўкі маглі б узначаліць гурткі, наладзіць заняткі з выканаўцамі.

Маладзечанскі семінар якраз і мае на мэце дапамогу кіраўнікам самадзейных калектываў. Праводзіць яго Мінскі абласны прамысловы Дом народнай творчасці.

Раней у Маладзечна праходзілі дэкадныя і двухтыднёвыя зборы харэографаў, дырыжораў духавых аркестраў, кіраўнікоў студый выяўленчага мастацтва, забаўнікаў. Цяперашні семінар самы вялікі — ён працягнецца месяц. На грамадскіх асновах тут будуць рыхтаваць спецыялістаў самай дэфіцытнай для самадзейнасці прафесіі — дырыжораў-харавікоў.

Адзін з галоўных выкладчыкаў на семінары —Эдуард Нікадзімавіч Ледаховіч — загадчык завочнага аддзялення Маладзечанскага музычнага вучылішча. Некалькі гадоў назад Э. Ледаховіч выдаў зборнік, у якім апублікаваў семдзесят запісаў народных мелодый Гродзеншчыны. Эдуард Нікадзімавіч—ініцыятар стварэння ў вучылішчы кабінета гуказапісу. Студэнты-завочнікі атрымліваюць заданні збіраць народныя песні, і паступова ў вучылішчы ствараецца унікальны па непаўторнасці фонд.

Выкладае на семінары і Осіп Фаміч Сушко—мастацкі кіраўнік Маладзечанскага народнага ансамбля.

Актыўны ўдзел у падрыхтоўцы будучых харавікоў прымае дырэктар Маладзечанскага музычнага вучылішча Л. Школьнікаў, мастацкі кіраўнік Лебедзеўскай народнай капэлы В. Багатаў, выкладчыца Н. Іванова, канцэртмайстар Л. Мінкевіч.

— А ці магчымая гэта задача— за месяц падрыхтаваць кіраўніка харавога калектыву?—пытаюся я ў дырэктара Дома народнай творчасці В. Носава.

— Магчымая,—упэўнена адказвае ён.—Вы толькі паглядзіце, як густа «населена» наша праграма. Тут і нотная грамата, і методыка дырыжыравання, і работа з хорам. Удзельнікі семінара наведаюць акрамя таго заняткі харавых калектываў музычнага вучылішча і народнага ансамбля, праслухаюць лепшыя ўзоры савецкай і класічнай музыкі, развучаць новыя песні. З Літоўскай ССР мы выпісалі вучэбны фільм «Методыка работы з самадзейнымі харавымі калектывамі». Трэба таксама ўлічыць, што ўсе ўдзельнікі семінара ўжо маюць вопыт работы ў гуртках, кіраўніцтва імі.

Хто ж яны, будучыя грамадскія дырыжоры-харавікі?

Віктар Чарняўскі — маляр Барысаўскага аўтарамонтнага завода. У самадзейнасці ён шэсць гадоў. За ўдзел у аглядах неаднаразова ўзнагароджваўся граматамі.

Люба Лук'яновіч кіруе калектывам самадзейнасці на Маладзечанскім хлебазаводзе.

Антаніна Гарошка — брыгадзір на птушкакамбінаце. Яна член КПСС, мае дзесяцікласную адукацыю. Сем са сваіх дваццаці пяці гадоў Тоня аддала самадзейнасці. «Больш за ўсё на свеце люблю спяванне»,—прызнаецца яна.

Міхася Асіповіча, загадчыка Заскаўскага сельскага клуба, выкладчыкі лічаць адным з самых падрыхтаваных сярод удзельнікаў семінара. Міхась—добры баяніст, ён адначасова кіруе некалькімі гурткамі.

Трэба было б яшчэ расказаць і пра прадаўшчыцу Алу Шусто, і пра пераплётчыцу Дануту Тавінь, і пра слесара Анатоля Ліскаўца. На прадпрыемствах, якія адпусцілі іх сюды на цэлы месяц, відаць, ускладаюць немалыя надзеі на семінар, і Ала, Данута, Анатоль імкнуцца ўсімі сіламі апраўдаць спадзяванні сваіх таварышаў.

...У камандзіроўку па песню, семінар песеннікаў. Можа, каму-небудзь здадуцца нечаканымі гэтыя спалучэнні слоў, для мяне ж яны поўныя незвычайнага сэнсу. Людзям патрэбны песні, песні, якія б па-сапраўднаму цешылі душу.

М. БАРЫСАЎ.

Спяванне хорам — мастацтва калектыўнае.

Гэта «ля».

Фота Э. ШАДУРЫНА.

Тэатр

НА ТРЭЦІ ДЗЕСЯТАК

У МІНУЛУЮ суботу ў Акадэмічным тэатры імя Янкі Купалы зноў узнялася заслона—пачаўся чарговы, сорак пяты сезон. Як і звычайна, ён адкрыўся купалаўскім спектаклем «Паўлінка».

«Паўлінка» ў купалаўцаў з'яўляецца ветэранам—самым старэйшым у тэатры спектаклем.

23 мая гэтага года ёй споўнілася дваццаць гадоў. Шчыра кажучы, гэтую дату трэба было шукаць і ўстанаўліваць па архівах нам самім. Тэатр жа нікога са сваіх гледачоў не запрашаў на дзень нараджэння спектакля. У той памятны вечар законнае месца «Паўлінкі» на куце заняла чарговая прэм'ера.

На спектаклі «Паўлінка» ў купалаўцаў глядзельная зала ніколі не пуставала. А пасля паказаў гледачам заўсёды было весялей, цяплей на душы — вясёлая, іскрыстая, вечна жыццярадасная купалаўская «Паўлінка» памагала людзям аднаўляць разбуранае, будаваць новае. Памагала жыць.

А як жа яна сама? Можа, пастарэла ці надарвала сілы? Дарэчы, былі ж у спектаклі і замены, у яго маляўнічую, ярка камедыйную плынь уліваліся і іншыя выканаўцы, новыя творчыя сілы тэатра. Прычым, яны ўваходзілі без пастаноўшчыка спектакля Льва Літвінава.

Між іншым, мы толькі здагадваемся, што пастаянны нагляд за спектаклем вядзе рэжысёр-асістэнт «Паўлінкі» Сцяпан Бірыла. А гэта работа заслугоўвае таго, каб выканаўцу яе спецыяльна адзначалі на афішах і ў праграмках. Вельмі цікава было б даведацца гледачам і пра тое, хто з акцёраў з'яўляецца пастаянным удзельнікам усіх спектакляў — «Паўлінка» ж за сваё доўгае жыццё як-ніяк паказвалася больш 500 разоў. На жаль, часам мы яшчэ не зусім добра ўмеем да ўсяго ставіцца па гаспадарску. Але гэтыя словы больш за ўсё датычаць тэатральнага кіраўніцтва.

Сёння ж, няхай сабе не ў дзень юбілею, з невялікім спазненнем — неяк няёмка было гаварыць пра жывы спектакль без сустрэчы, завочна — хочацца перш-наперш павесці гаворку пра саміх творцаў пастаноўкі. Лёс «Паўлінкі» ў цэлым, як бачым, шчаслівы—які яшчэ з жывых спектакляў можа сёння спаборнічаць з ім у даўгалецці ці аспрэчваць славу!

Шчасце напаткала гэты спектакль ужо даўно, калі ён толькі яшчэ пачынаў сваё жыццё. У «Паўлінцы» падабраўся на дзіва моцны і баяздольны акцёрскі ансамбль. Барыс Платонаў, Глеб Глебаў, Вера Пола, Уладзімір Дзядзюшка, Лідзія Ржэцкая, Іван Шаціла, Раіса Кашэльнікава — выканаўцы літаральна ўсіх роляў з часам заслужылі годнасць народных артыстаў, і многія з іх не адзін раз, што называецца, упрыгожвалі спектаклі купалаўскай сцэны. Гэты ансамбль надзвычай трапна прыйшоўся да камедыі «Паўлінка». Пераменіць яго, вядома, можна. Але зусім замяніць гэтых удзельнікаў надзвычай цяжка, якой бы здольнай і таленавітай ні была гэтая замена.

Аднак спектаклю «Паўлінка» вельмі спатрэбіліся новыя выканаўцы — дзеля яго ж даўжэйшага жыцця. Ролю Паўлінкі Р. Кашэльнікава перадала Бяруце Дакальскай, замест І. Шацілы Якіма Сароку стаў іграць Уладзімір Кудрэвіч, а Б. Платонава ў ролі Адольфа Быкоўскага замяніў Здзіслаў Стома. Той, хто бачыў спектакль у першым складзе, цяпер, безумоўна, адзначыць пэўныя страты. Але мне не хочацца ўпікаць маладзейшых выканаўцаў, параўноўваючы іх з майстрамі. Тым больш, што яны з часам, асабліва калі гаварыць пра З. Стому, знаходзяць для сваіх вобразаў усё больш і больш яркіх, каларытных штрышкоў.

У дзень сёлетняга адкрыцця сезона ў «Паўлінцы» бралі ўдзел усе цяперашнія асноўныя выканаўцы. Акцёры сярэдняга пакалення і моладзь, яшчэ ўчарашнія выпускнікі інстытута, удзельнічалі ў масавых сцэнах. Ролю ж Пранцыся Пустарэвіча іграў, як і дваццаць гадоў назад, Глеб Глебаў, ролю Агаты выконвала Вера Пола, у ролі Сцяпана Крыніцкага выступіў Уладзімір Дзядзюшка, у ролі Альжбеты — Лідзія Ржэцкая. І ўсе яны жылі тымі ж самымі, як і шмат гадоў назад, думкамі і пачуццямі.

Праўда, на гэты раз Альжбета не пускалася ў заліхвацкія скокі з Пранцысем Пустарэвічам. А гэта ж у свой час была адна з лепшых сцэн у Л. Ржэцкай. Цяпер яе гераіня прысела толькі паназіраць за іншымі, а яе партнёр змушаны быў запрасіць на танец больш маладую выканаўцу. І таму міжволі страцілі ў спектаклі сэнс словы, калі Пустарэвіч гаворыць Крыніцкаму: «Собсцвена, і дала ж твая баба мне дыхту, вось-цо-да. Аж лыткі трасуцца, пане дабрадзею».

Невядома, навошта спатрэбілася Л. Ржэцкай замяняць купалаўскае «пасаг» словам «прыданае», і партнёру па спектаклю Ул. Дзядзюшку следам за ёй паўтараць тое ж самае. (Наогул, у тэатры чамусьці не давяраюць гэтаму сакавітаму народнаму слову, усяляк стараючыся замяніць яго іншым).

Але ўсё гэта — толькі накладкі. У цэлым жа вечар мінулай суботы з'явіўся сапраўдным трыумфам глыбокіх самабытных акцёрскіх талентаў і выдатнага майстэрства купалаўцаў. Яго можна лічыць сапраўдным святам нашага тэатральнага мастацтва.

Молада, з захапленнем і творчым энтузіязмам іграў Глеб Глебаў. Яго вялікая арганічнасць, камедыйны бляск, цудоўная пластыка захаплялі кожнага. Па-майстэрску, з вялікім тэмпераментам правёў сваю ролю Уладзімір Дзядзюшка. Сакавітасцю, глыбокай народнасцю, рэдкім камедыйным талентам радавала гледачоў Вера Пола. Асабіста мне здаецца, што ў вобразе Агаты яна ўвесь час не стамляецца творча расці, заваёўваючы ўсё новыя вышыні. Пра адзін толькі танец гераіні ў доме Крыніцкіх можна было б пісаць многа і з захапленнем.

Што яшчэ можна дадаць у заключэнне? Ды, бадай, тое ж самае, што гавораць юбілярам: доўгіх-доўгіх год жыцця табе, «Паўлінка», і каб заўсёды ты несла людзям радасць!

Анатоль САБАЛЕЎСКІ.

На здымку — сцэна са спектакля «Паўлінка». У ролі Паўлінкі — Б. Дакальская, Адольфа Быкоўскага — З. Стома.

Фота Ул. КРУКА.

ГІСТОРЫЯ АДНАГО ПОДЗВІГУ

У магазіны Мінска паступіла кніга «Гісторыя аднаго подзвігу». На яе супервокладцы паказан чырвоназоркавы знішчальнік, які імкліва нясецца на ворага. Ён адзін супраць вялікай чарады фашысцкіх сцярвятнікаў.

Кніга Рыгора Меня, выпушчаная выдавецтвам «Беларусь», расказвае пра бессмяротны подзвіг бясстрашнага сына беларускага народа, Героя Савецкага Саюза Аляксандра Гараўца. Прадмову да кнігі напісаў маршал авіяцыі С. Красоўскі, які ў гады вайны асабіста ведаў адважнага баявога лётчыка.

Гісторыя кароткага жыцця сельскага школьніка з вёскі Гараўцы, а затым слесара-водаправодчыка з Віцебска і вучлёта абласнога аэраклуба, курсанта Ульянаўскай лётнай школы, а затым лётчыка-інструктара Шахцінскага аэраклуба ў Данбасе рысуецца на фоне жыцця ўсёй краіны і справу яго таварышаў па працы і авіяцыйнай вучобе.

Амаль палавіна кнігі прысвечана знаходжанню адважнага лётчыка на фронце ў 166 авіяцыйным знішчальным палку. Вучоба ў прыфрантавых умовах, вылеты на патруляванне, баі супраць варожых самалётаў і нарэшце неўміручы подзвіг у час палёту ў раёне Уладзіміраўка—Качатоўка—Зарыцкія Двары—Альхаватка. Гэты ўчастак быў часткай велізарнага поля бітвы на Курскай дузе. Быццам маланка дзейнічаў савецкі лётчык супраць 20 варожых машын. З 9 збітых фашысцкіх самалётаў апошні быў знішчан тараннным ударам. Так загінуў А. К. Гаравец. Яго астанкі былі знойдзены разам з самалётам пасля вайны.

У кнізе змешчана зводка Саўінфармбюро за 13 ліпеня 1943 года, дзе гаворыцца пра подзвіг Аляксандра Гараўца. З асаблівым хваляваннем знаёмішся з лаканічнымі радкамі з узнагароднага ліста: «Дастойны звання Героя Савецкага Саюза. Генерал арміі Н. Ватуцін. Член Ваеннага Савета Варонежскага фронту генерал - лейтэнант М. Хрушчоў».

БЕЛТА.

З ЮБІЛЕЕМ, ДАРАГІ СЯБРА!

Сёння спаўняецца 50 год вядомаму рускаму паэту, добраму сябру Беларусі Браніславу Кежуну. Яго пяру належаць пераклады на рускую мову твораў многіх беларускіх паэтаў.

У сувязі з юбілеем прэзідыум Саюза пісьменнікаў БССР накіраваў Б. Кежуну віншаванне, у якім гаворыцца:

«Дарагі Браніслаў Адольфавіч! Беларускія пісьменнікі сардэчна віншуюць Вас, цудоўнага паэта, вялікага нашага сябра, са слаўным днём пяцідзесяцігоддзя і жадаюць моцных сіл, здароўя, новых твораў, вострых, вясёлых, якія радуюць нас і ўсю многанацыянальную савецкую літаратуру».

Рэдакцыя нашай газеты далучаецца да гэтага віншавання і жадае юбіляру шчасця і творчых поспехаў.

ПРЭМ'ЕРА БАРЫСАЎЧАН

Нядаўна Барысаўскі народны тэатр выступаў на сцэне Крамлёўскага тэатра ў Маскве са спектаклем «Глыбокая плынь» (інсцэніроўка С. Гурыч па раману І. Шамякіна). І вось новая падзея ў культурным жыцці нашага горада — прэм'ера спектакля «Дрыгва» па п'есе польскага драматурга Пятра Хайноўскага, пастаўленая заслужаным дзеячам культуры БССР Ф. Міхайлавым.

Драматург дае шырокую карціну грамадскага жыцця Польшчы пачатку XX стагоддзя. Асабліва выразна паказаны той фінансавы ланцуг, які скоўвае людзей, што апынуліся на розных грамадскіх ступенях капіталістычнага свету... Усё падпарадкавалі сабе грошы: годнасць і гонар збяднелых землеўласнікаў, кар'еру іх сыноў і маральныя якасці дочак...

Як справіўся калектыў Барысаўскага народнага тэатра з такой складанай пастаноўкай?

Спектакль у асноўным удаўся. Аднак, калі ацэньваць новую работу тэатра па вялікім рахунку, без скідак, трэба выказаць і крытычныя заўвагі. Кідаецца ў вочы налёт меладраматычнасці, некаторая расцягнутасць, запаволенасць дзеяння. Умелай рэжысёрскай карэктурай можна было б паскорыць рытм спектакля. Гэта толькі палепшыла б цэльнасць яго ўспрымання.

Калі гаворка ідзе аб творчасці самадзейных артыстаў, спевакоў, танцораў, мастакоў, звычайна большасць крытыкаў прымае тон «добрага дзядзькі»: хваляць за поспех і абыходзяць маўчаннем недахопы. Маўляў, няма чаго крытыкаваць чалавека, які ўдзень стаіць ля станка, а ўвечары аддае свой вольны час заняткам у гуртках самадзейнасці. Але ж самі аматары гавораць, што яны не **ахвяруюць, а прысвячаюць** свой вольны час любімаму мастацтву. І ацэньваць сваю працу яны просяць без скідак.

Барысаўскаму народнаму тэатру пяць гадоў. За гэты час калектыў многаму навучыўся, многае зрабіў. У «Дрыгве» заняты асноўны склад тэатра. Большасць выканаўцаў ужо шмат гадоў іграюць на самадзейнай сцэне.

Артыстка народнага тэатра Ганна Беркман іграе ролю Урублеўскай — удавы, на плячах якой ляжаць клопаты аб усёй сям'і. Пад цяжарам жыццёвых нягод, заблытаўшыся ў сваіх фінансавых справах, яна ўсё ж спрабуе захаваць прыстойнасць.

Ганна Беркман — работніца магазіна, удзельнічаючы ў тэатральнай самадзейнасці, сыграла шмат роляў. Бадай найбольш удалай была роля Бабулі з п'есы А. Касона «Дрэвы паміраюць стоячы». Урублеўская, якую іграе Беркман у «Дрыгве», трошкі аднапланавая. Мы бачым выразна яе гнеў, чуем жаслівы плач, ліслівую гаворку. Аднак шматграннага вобраза Урублеўскай, якой уласцівы і ганарыстасць, і балбатлівасць, і вульгарнасць, і ліслівасць, і дабрата, і чуллівасць, актрыса яшчэ не стварыла. Усё гэта губляецца за празмернай экспансіўнасцю, якая часам пераходзіць у меладраму.

Ролю Ядзі—старэйшай дачкі Урублеўскай выконвае артыстка тэатра Валянціна Дзедумет. Урублеўская—эмансіпіраваная жанчына. У яе было няўдалае замужжа. Пагроза поўнай беднасці прымушае яе ахвяраваць сабою, сваім шчасцем дзеля выратавання сям'і. Гэта цэнтральны вобраз п'есы. Аднак В. Дзедумет іграе сваю Ядвігу павярхоўна. Вонкавая прыгажосць, цудоўны голас і дыкцыя, выдатная пластыка рухаў выканаўцы— усё гэта, на жаль, не выратоўвае вобраз, — ён нейкі статычны. Калі ў ролі Рэневай з п'есы А. Астроўскага «Свеціць, ды не грэе» з уласцівай Дзедумет эксцэнтрычнасцю можна было мірыцца, — гэта было ў характары вобраза Рэневай, дык вобраз Ядвігі трэба было ствараць з большым унутраным хваляваннем. В. Дзедумет трэба пазбавіцца скарагаворкі і наўмыснай тэатральнасці ў мове.

Пшэцэхоўскі — юрыст па адукацыі, дзялок па натуры, цынік па прыродзе — нажыў багацце ўдалым махлярствам. Яго іграе мастак тэатра Сурэн Мірзаян увогуле блізка да сутнасці вобраза. Іншы раз толькі праяўляецца празмерны тэмперамент, неўласцівы халоднаму і разважліваму Пшэцэхоўскаму.

Наладчык завода гідраапаратуры Анатоль Грачышкін іграе Парэмбскага—маладога скульптара, закаханага ў Ядзю. Яму варта пазбавіцца запаволенай манеры ігры і мноства паўз, якія парушаюць рытм спектакля.

Радуе ў рабоце тэатра тое, што творчы калектыў яго поўны энергіі, ён не спыняецца перад цяжкасцямі і ўдасканальвае сваё майстэрства ад спектакля да спектакля.

А. ХОМІЧ.

ЗАПРОШАНЫ Ў СТАЛІЦУ

Гэтымі днямі з Магілёва ў Маскву для выступленняў з канцэртамі на Выстаўцы дасягненняў народнай гаспадаркі выехалі лепшыя калектывы мастацкай самадзейнасці вобласці. Сярод іх—народны ансамбль танца Палаца культуры завода штучнага валакна, народны хор даярак Варатынскага сельскага клуба Бабруйскага раёна, маладзёжны ансамбль песні Касцюковіцкага раённага Дома культуры.

Ансамбль пакажа масквічам каля 20 танцаў. Сярод іх — харэаграфічная сюіта «Дружба народаў», беларуская маладзёжная сюіта, беларускі народны танец «Лявоніха», беларуская калгасная полька, рускі карагод, салдацкая пляска і многія іншыя танцы народаў СССР і краін народнай дэмакратыі.

У рэпертуары народнага хору Варатынскага сельскага клуба — беларускія і рускія народныя песні, калгасныя прыпеўкі. Рэпертуар маладзёжнага ансамбля песні Касцюковіцкага РДК складаецца з песень беларускіх кампазітараў і твораў, напісаных кіраўніком ансамбля самадзейным кампазітарам В. Ражкіным.

А. ГОЛЫШ.

ПА ЗАКАЗАХ АМАТАРАЎ СЦЭНЫ

Майстэрні Беларускага тэатральнага таварыства за апошні час атрымалі шмат заказаў ад самадзейных мастацкіх калектываў рэспублікі. Адным патрэбны касцюмы для танцораў. Другім — для драматычнага гуртка. Нядаўна прыйшоў заказ ад аматараў самадзейнага мастацтва Полацкага нафтабуда. Яны просяць зрабіць для іх нацыянальныя касцюмы братніх рэспублік, а таксама польскае і румынскае нацыянальнае адзенне.

Нядаўна майстэрня выканала заказы аматараў сцэны Мінскага аўтазавода, Полацкага завода шкловалакна, Палаца культуры Аршанскага ільнокамбіната і многіх іншых. Для іх зроблены касцюмы, бутафорыя, абутак.

В. ШЫМОЛІН.

Пры Доме культуры калгаса імя XXII з'езда КПСС Гомельскага раёна працуе самадзейны ансамбль песні і танца «Колас». У ім удзельнічаюць калгаснікі, вучні-старшакласнікі Яромінскай сярэдняй школы. У складзе ансамбля — харавая і танцавальная групы, цымбальны аркестр. Самадзейныя артысты рыхтуюць новую музычна-харэаграфічную кампазіцыю «Паэма пра хлеб», якую яны пакажуць на калгасным свяце «Залатая восень».

На гэтым здымку, які зрабіў фотакарэспандэнт М. Мінковіч, вы бачыце рэпетыцыю цымбальнага аркестра.

І ПАЙШОЎ ДАРОГАЙ РОСТУ...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

ва,—чаму тая ж крытыка, маючы справу з пасрэдным раманам на сучасную тэму, сарамліва забываецца і на традыцыю, і на багаты мастацкі вопыт, які ўжо набыты літаратурай да гэтага, якім трэба абавязкова вымяраць і гэты раман, — абмяжоўваецца публіцыстычнымі разважаннямі пра важнасць і значнасць тэмы, у лепшым выпадку папракае аўтара за дробныя моўныя агрэхі і ставіць, нарэшце, выразную пячатку: «Але, нягледзячы на недахопы, з'яўляецца ўкладам...» Чакайце, якім укладам: у ашчадную кніжку?..

Мы наглядаем парадаксальную з'яву: чым больш аддаецца ўвагі сучаснасці, тым, як выяўляецца, горш для яе. Ствараецца нейкая штучная аўтанамізацыя твораў аб сучаснасці ў межах агульнага літаратурнага працэсу: крытэрыі, абавязковыя пры ацэнцы адных твораў, робяцца неабавязковымі для другіх, тэзіс аб майстэрстве прымаецца на словах, а на справе часта падмяняецца, выцясняецца тэзісам аб важнасці, актуальнасці тэмы і г. д. Любімае дзіця вырастае капрызлівым, пачынае думаць, што для яго, як кажуць, не пісаны закон. Ці не занадта многа ля яго паблажлівых нянек ад крытыкі, ці не занадта многа дабрадушных апекуноў?

Не, усё павінна быць інакш: менш прывілей для твораў аб сучаснасці і як мага больш патрабавальнасці да іх. Творы гэтыя павінны разглядацца ў агульнай літаратурнай плыні і ацэньвацца пры дапамозе крытэрыяў, аднолькава строгіх для любога жанру, любой тэмы. Тады і пісьменнікі, што займаюцца распрацоўкай сучаснай тэмы, будуць больш сур'ёзна ставіцца да сваёй творчасці, больш плённа будуць скарыстоўваць мастацкі вопыт, ужо набыты літаратурай.

Не трэба закрываць вочы на цяжкасці ў асваенні сучаснай тэмы. Літаратура падступаецца да яе, аднача́сова пазбаўляючыся ад цяжкага грузу нядаўняга мінулага, ад ілюстрацыйнасці, рацыяналізму і лёгкадумнасці ў вырашэнні надзённых праблем сучаснага жыцця. Нельга тут не ўлічваць і прыватных, спецыфічных праблем у асваенні тэмы сучаснасці, якія ёсць у кожнай нацыянальнай літаратуры. Улічваць усё гэта павінна ў першую чаргу крытыка: не захапляцца па чарзе росквітам апавядання ці рамана, а глыбока аналізаваць прычыны поспехаў і няўдач. І тады можа здарыцца так, што не пра адставанне апавядання наогул трэба гаварыць, а пра пакутлівае набыццё ім таго новага вопыту ў асваенні сучаснага жыцця, які так трэба раманістам і які яны часам хочуць набыць з налёту і адразу.

4. СТРАШНА вымавіць: раман! Нават вялікі Чэхаў адчуваў боязь перад гэтай вялізнай рамай жыцця—раманам. Яшчэ ніяк не звыкнуцца было з агромністасцю гмаха талстоўскага «Вайны і міру», і Чэхаў то ўсур'ёз, то жартам казаў, што раманы ўмеюць пісаць хіба толькі дваране, што разначынцам, дзецям шэрай будзёншчыны, гэта не пад сілу. Сам ён не напісаў рамана, хоць, кажуць, усё жыццё збіраўся напісаць яго. Але не будзем надта шкадаваць аб гэтым. Сёння многія з яго апавяданняў называюць раманамі, бо тое, што ўціснута ў скупыя чэхаўскія старонкі, варта раманаў. І што б ні называлі мы цяпер раманам, мы непазбежна звязваем з гэтым паняццем грандыёзнасць жыцця, узноўленага мастацкімі сродкамі, вялікую думку і вялікую душэўную шчодрасць мастака, уменне паказаць чалавека ва ўсёй складанасці яго сувязей з часам і жыццём.

І вось чаму нам, успамінаючы даволі значную колькасць раманаў, напісаных у апошні час, цяжка захапіцца і на поўным сур'ёзе весці гаворку ледзь не пра залаты перыяд эпікі. Вядома, колькасць нейкім чынам павінна перарастаць у якасць, але гэта не азначае, што кожны з напісаных раманаў выдатны.

Наш раман яшчэ ўвесь у пошуках, у станаўленні. Ён развітваецца з убоствам аўтарскай думкі, ілюстрацыйнасцю, шукае і знаходзіць сябе як жанр. Пасля рамана Мележа яскрава відаць, што некаторыя з тых твораў, якія дагэтуль лічыліся раманамі, не раманы зусім, а проста вымушанае суіснаванне пад адной вокладкай асобных эпізодаў і сцэн, так-сяк аб'яднаных больш ці менш займальнай фабулай.

Сёння нам трэба не раман-ілюстрацыя, а раман, які меў бы на мэце глыбокае даследаванне жыцця, грунтаваўся б на арыгінальнай мастацкай канцэпцыі і арыгінальнай задуме. Раман, які называецца так не таму, што мае адпаведную колькасць старонак, а таму, што аўтарская задума не магла быць рэалізавана інакш, чым у жанры рамана.

Сярод некаторых нашых эпікаў заўважаецца цяга да рамана-хронікі. «Серадзібор» П. Пестрака, «Засценак Малінаўка» А. Чарнышэвіча менавіта такія творы. Варта прыгадаць, што і «Людзі на балоце» І. Мележа пачынаюць сабой цыкл раманаў «Палескай хронікі». Праўда, у адрозненне ад Пестрака і Чарнышэвіча, сама структура раманаў якіх у той ці іншай ступені вызначаецца абраным жанрам, Мележ надае паняццю хронікі больш шырокі, можа, не столькі жанравы, колькі тэматычны сэнс.

Не будзем пакуль думаць, быццам за ўсім гэтым ёсць нейкая заканамернасць, ледзь не імкненне абнавіць эпічны жанр, адступіцца ад традыцыйнай формы рамана. Больш цікава, як выкарыстоўваюцца аўтарамі тыя магчымасці, што закладзены ў абраным жанры. І вось тут, калі станеш бліжэй прыглядацца да твораў, у прыватнасці, да раманаў Пестрака і Чарнышэвіча, заўважаеш, што іншы раз аўтары не столькі стараліся як найлепш выкарыстаць магчымасці жанру, колькі спакушаліся магчымасцю абысці некаторыя з тых строгіх патрабаванняў, што звычайна прад'яўляе да пісьменніка раман.

Вось чаму мы там-сям пад выглядам хронікі сустракаем самую звычайную фрагментарнасць, рэгістрацыю фактаў, апісальніцтва без абагульняючай думкі, без выразнай і глыбокай задумы.

Даволі істотным недахопам цікавага рамана П. Пестрака трэба лічыць якраз слабасць мастацкай канцэпцыі і, як вынік гэтага, у многіх выпадках непераканаўчую рэалізацыю задумы. Тыя цяжкасці ў жыцці калгаснай пасляваеннай вёскі, пра якія аўтар імкнецца гаварыць, канфлікты, на якія акцэнтуе ўвагу, не ўсюды атрымалі арганічнае ўвасабленне сродкамі жанру. Аўтар дзенідзе падмяняе мастацкае вырашэнне канфлікту простай спасылкай на тыя ці іншыя мерапрыемствы партыі ў галіне сельскай гаспадаркі. А нам хацелася б, каб сэнс змен у жыцці нашага грамадства, у жыцці калгаснай вёскі сцвярджаўся ў першую чаргу ўсім мастацкім ладам рамана, набываў канкрэтна-мастацкае гучанне.

Чытачы з цікавасцю сустрэлі новы раман А. Чарнышэвіча «Засценак Малінаўка». Без перабольшання сказаць, у творы ёсць выдатныя старонкі: побыт вёскі, яе будні і святы, пастаянны клопат селяніна пра кавалак хлеба, пра дабрабыт сям'і, непрымірымая варожасць паміж бедняком і багацеем— усё гэта перададзена ў рамане надзвычай пераканаўча, праз гісторыю многіх сем'яў і чалавечых лёсаў.

А. Чарнышэвіч паказвае беларускую вёску напярэдадні першай рэвалюцыі, вёску, якая ўся ва ўладзе класавых супярэчнасцей, сквапнасці, пастаяннай грызні за капейку, за кавалак зямлі, за лапік сенажаці. Усё вымяраецца капейкай, усё падуладнае ёй: каханне, сумленне, месца ў грамадстве. Малады гаспадар Андрэй Сташэвіч баіцца, што багатыр Асіеўскі не аддасць за яго дачку Ганну. Ён жа пакутліва перажывае праз тое, што сястра Алена можа спакусіцца багаццем засцянкоўца Яўхіма Халусты, пайсці замуж за ягонага сына—прыдуркаватага Юзіка. Старэйшая Андрэева сястра, пайшоўшы замуж у багатую сям'ю, забываецца на дом. Лічыцца звычайным, што парабку не месца на вечарынцы, дзе гуляюць засцянкоўцы. «Святы» чалавек Гарасім Жукоўскі, што чытае царкоўныя кнігі, любіць пагаварыць пра любоў да бліжняга, імгненна забываецца на ўсёдараванне, як толькі дазнаецца, што сваяк Мартыневіч украў з ягонага свірна кошык яблык. Той жа Мартыневіч, арандуючы Гарасімаву паўвалску, чакае не дачакаецца, калі памрэ стары, каб завалодаць ягонай зямлёй. Мясцовы Плюшкін, хцівец Халуста таксама кваліцца на гэтую паўвалоку.

Невясёлыя, вельмі невясёлыя карціны малюе ў рамане А. Чарнышэвіч. Але ён не мог інакш: ён пісаў праўду, горкую, але сапраўдную праўду.

Калі чытаеш раман, міжволі прыгадваеш некаторыя старонкі з «Людзей на балоце» І. Мележа. Вядома, у кожнага з пісьменнікаў свае задачы, свой жыццёвы матэрыял. Палескія Курані наколькі падобны на Малінаўку пад Слуцкам, настолькі і розняцца ад яе. І справа тут не толькі ў мясцовай своеасаблівасці побыту, агульнай завядзёнкі жыцця ў гэтых вёсках. Справа ў двух дзесяцігоддзях у той гістарычнай паласе, адзначанай трыма рэвалюцыямі, перамогай бальшавікоў, якая ляжыць паміж малінаўцамі і куранёўцамі. А. Чарнышэвіча цікавіць выспяванне рэвалюцыйных настрояў у сялянскай масе, Мележа—тое, як ідэі здзейсненай рэвалюцыі пераўтвараюць жыццё сялянства.

І разам з тым цікавая рэч: у вёсцы Мележа большая традыцыйнасць, устойлівасць сялянскага побыту, у ёй больш рэшткаў патрыярхальшчыны, чым у перадрэвалюцыйнай вёсцы Чарнышэвіча, дзе класавыя супярэчнасці выяўлены надзвычай ярка, дзе ўжо гнуткая сацыяльная іерархія, куды пранікаюць ужо больш-менш «культурныя» метады абдзірання бедняка. Праблема бедняка і кулака істотная і для рамана Мележа. Але, паўтараем, час не кранууўся жыцця куранёўцаў у такой ступені, як гэта мы наглядаем у Малінаўцы: тут жыццё ідзе марудней, тут і клопат здаецца працейшым і сацыяльныя страсці як быццам цішэйшыя. І, можа, гэтая патрыярхальная ў пэўным сэнсе плынь жыцця куранёўцаў, гэтая прастата сацыяльных адносін памагла Мележу з такой мастацкай прастатой і выразнасцю, такой тыповасцю выказаць у рамане і адвечны для мінулага канфлікт беднасці і багацця і даць адчуць па кантрасту веліч таго новага, што несла рэвалюцыя ў вёску. Мала каму з нашых пісьменнікаў удалося дасягнуць такога арганічнага зліцця чалавека з побытам, з асяроддзем, намаляваць характары такой жыццёвай паўнаты, такой натуральнасці іх праяўлення, як гэта мы наглядаем у рамане Мележа.

А. Чарнышэвіч, наадварот, падкрэслівае ў характары, кажучы словамі тэатральнага крытыка, характарнасць, сэнс душэўнага жыцця чалавека ён пераважна перадае толькі праз знешні жэст, праз дзеянне, праз вынік. Гэтая адметнасць манеры дае ў лепшых выпадках значны мастацкі эфект, памагае з выключнай яркасцю выказаць сэнс характару, філасофіі чалавека, але ў нечым істотным і збядняе ўсё ж мастацкую канцэпцыю рамана, пазбаўляе твор паўнаты сінтэзу, аб'ёмнасці ў абмалёўцы жыцця.

Аўтар усюды настойліва падкрэслівае сацыяльныя матывы паводзін герояў. Гэта добра: сацыяльны, грамадскі аспект—тая галіна, дзе з найбольшай сілай праяўляецца сэнс дзейнасці чалавека, але ж, калі неасцярожна абсалютызаваць сацыяльны пачатак, калі не разнастаіць паказ яго праяўленняў у паводзінах людзей, мастацкі твор непазбежна набудзе ілюстрацыйнасць, праіграе ў мастацкім змесце, у перадачы жывых адценняў жыцця. Менавіта такое іншы раз мы наглядаем у Чарнышэвіча.

Мастацкі твор павінен будавацца на магчыма большай колькасці жыццёвых каардынат. Паказ, напрыклад, сквапнасці можа мець і павінен мець не толькі сацыяльны, але і маральны аспект. Багацце не толькі дае ўладу, месца ў грамадстве, але і маральна спустошвае чалавека: беднасць можа быць высакароднай і сумленнай, але як яна ў той жа час можа прынізіць чалавека, зрабіць з яго Акакія Акакіевіча! І першае, і другое—зло, бо непазбежна пазбаўляе паўнаты жыцця, абуджае ў чалавеку нездаровыя страсці, інстынкты і г. д. Барацьба за сацыяльную справядлівасць—гэта барацьба не проста за кавалак хлеба, гэта барацьба за магчымасць праяўлення ў чалавеку ўсяго лепшага, што закладзена ў ім, гэта прадумова магчымасці хутчэй убачыць у сабе падобным чалавечнага чалавека.

Мы не навязваем Чарнышэвічу сваю думку, мы хочам толькі сказаць, што аднабаковасць у мастацкай абмалёўцы жыцця вядзе да збяднення задумы нават самай добрай, пазбаўляе твор глыбокага чалавечага зместу! Успомнім зноў Мележа: з якой сілай паказана ў яго трагедыя Ганны, як многа матывіровак можа знайсці ўважлівы чытач, калі захоча прааналізаваць, чаму Ганна выходзіць замуж за Яўхіма Карча. Тут і традыцыйнае: усе так робяць, кожны глядзіць, каб лепш, і жаданне памагчы бацькам, і тая самастойнасць, упэўненасць, дарослась, якой так і патыхае ад Яўхіма і якой не можа знайсці Ганна ў падлетка Васіля з ягоным сарамлівым, зацятым каханнем. З вялікім псіхалагічным пранікненнем выпісаны аўтарам нешматлікія сустрэчы Ганны з Яўхімам. Натуральнасць унутранага жыцця герояў — адна з самых прываблівых якасцей рамана Мележа. У Чарнышэвіча ж не ўсюды і не заўсёды адчуваецца аўтарская ўлада над героямі.

Даволі бледным у мастацкім сэнсе атрымаўся ў Чарнышэвіча паказ «новых людзей» вёскі, тых, хто не хоча мірыцца са старой завядзёнкай жыцця, з сацыяльнай няроўнасцю, з прыніжанасцю чалавека. У рамане два цэнтры, два планы—маёнтак Чыжэвічы, дзе працуюць парабкі Станіслаў Вярбіцкі, Павел Квітун і інш.—удзельнікі групы сацыял-дэмакратаў, і Малінаўка, мастацкім цэнтрам у паказе якой з'яўляецца Андрэй Сташэвіч. І калі Андрэй надзелены ўсё ж большай ці меншай непаўторнасцю характару, унутранага жыцця, дык Вярбіцкі, Квітун і Шэмет не вызначаюцца ні асаблівай індывідуальнасцю, ні арганічнасцю адчуванняў і думак.

Паказаць, як са старога выспявае новае, не так лёгка. Калі паявіўся часопісны варыянт рамана Мележа, крытыкі і чытачы сталі папракаць аўтара за недастатковую выразнасць вобраза Міканора, які нясе ў вёску новыя ідэі, новыя паняцці, новы змест жыцця. Мележ вярнуўся да гэтага вобраза і ўвёў у раман новы раздзел. І ўсё ж трэба шчыра сказаць: раздзел гэты не з самых лепшых у творы, у вобразе Міканора пісьменнік не дасягае таго зліцця з адчуваннямі, думкамі, клопатамі вясковай масы, якое бачым на іншых старонках рамана.

Вопыт П. Пестрака, А. Чарнышэвіча і часткова І. Мележа сведчыць пра цяжкасці росту нашага рамана, пра тое, як нялёгка адмаўляцца прозе ад ілюстрацыйнасці, апісальніцтва, ад схематызму.

5. І ВОСЬ ужо аўтар глядзіць на артыкул вачамі чытача. Яму ўяўляецца такая размова:

А. Па-мойму, аўтар занадта нападае на крытыкаў. Крытыкі розныя ёсць: горшыя і лепшыя, але не ўсім жа быць Бялінскімі.

Б. І ўсё-ткі хоць аднаго Бялінскага няблага было б мець.

А. Але ж у нас затое ёсць крытычная секцыя—гэта таксама нечага варта. Ды і потым: хто можа даць гарантыю, што ваш новы Бялінскі не наломіць дроў?

Б. Вы кажаце праўду: ніхто такой гарантыі не дасць.

А. Па-мойму, аўтар недаацэньвае раман Чарнышэвіча. Хваліць, хваліць, а потым і таго няма, і тут дрэнна, і там недацягнуў, і недзе пераstараўся...

Б. Аўтар, вядома, сказаў пра раман не ўсё. Ён мог бы адзначыць і выдатнае майстэрства дыялога, і тое непрыблізнае веданне вясковага жыцця, якое дазволіла пісьменніку дакладна намалёўваць не толькі бытавыя сцэны, але і тонка паказаць механізм сацыяльных сувязей у вёсцы. Шмат чаго добрага можна знайсці ў рамане. Але, разам з тым, шмат за што яшчэ можна і папракнуць Чарнышэвіча: і за рыхлаватасць кампазіцыі, і за непатрэбныя з пункту гледжання мастацкай значнасці эпізоды і сцэны, і за недастатковае развіццё некаторых цікавых сюжэтных ліній, і за пэўную адНастайнасць пейзажу.

А. А нацыянальны каларыт рамана? А веданне народнай мовы? А прастата і даступнасць формы?

Б. Правільна, усё гэта ў рамане ёсць, але ж гэта ёсць і ў іншых нашых раманах. Мне здаецца, варта ўжо ісці далей: паказваць, як праяўляецца нацыянальны характар, значныя падзеі народнага жыцця ў духоўнай, інтэлектуальнай сферы. Так, напрыклад, робіць у рамане «Птушкі і гнёзды» Я. Брыль. Я перакананы ў важнасці такой задачы і, каб быў крытыкам, напісаў бы пра гэта і паспрабаваў бы сваю думку абгрунтаваць.

А. Дык вазьміце і напішыце—вось і з'явіцца гэты ваш новы Бялінскі.

Б. Вы пачынаеце жартаваць!

Магчыма, такая размова можа адбыцца, магчыма—іншая. Не ведаем. Ведаем адно: раманы, што паявіліся ў апошні час, даюць багаты матэрыял для сяровак, для роздуму над шляхамі далейшага развіцця беларускай прозы. Наперадзе ў рамана шырокая дарога: на ёй падпільноўваюць раманістаў новыя цяжкасці, але, безумоўна, і новыя творчыя заваёвы.

Поспехаў табе, раман!

КІНО

А ПРЫЁМ ЖА ГОЛЫ...

Э. МІЛОВА

Бывае так: чалавеку сняцца розныя гісторыі, ды так выразна, што ён у сне і пакутуе, і радуецца, і з некім б'ецца, і кагосьці абдымае... Або інакш: бачыць, як нешта адбываецца побач, а ступіць, працягнуць руку, умяшацца — не можа...

Апошні варыянт карыстаецца асаблівай папулярнасцю ў ранішнія гадзіны на камунальных кухнях. Усе дружна думаюць: да чаго б гэта?

...За сорак мінут да світання на трыццаць шостым кіламетры Магілёўскай шашы спынілася таксі, і з яго выйшаў пажылы чалавек. Загучаў яго ўнутраны голас, і мы даведаліся, што ён «даўно ўжо думае пра сваіх таварышаў», якія дваццаць гадоў назад абаранялі наш горад.

Разам з ім сілаю зрокавай памяці мы выклікалі акопы і грукат бою на трыццаць шостым кіламетры... А потым вярнуліся ў наш час і прыехалі да дзяўчыны, якую ён кахаў у дні сваёй франтавой маладосці. І паглядзелі, як яна цяпер жыве, гэтая былая «Ластаўка», сувязістка Ніна.

Потым мы наведалі былога адважнага разведчыка, «ротнага Цёркіна» — Рыгора Батуру, цяпер старшыню вялікага калгаса, і, нарэшце, апынуліся ў клініцы славутага, вядомага ва ўсім свеце хірурга, былога фельчара Васі.

А потым загучалі акорды фіналу, і мы зноў убачылі пустынную перад світаннем шашу, і ўнутраны голас былога камандзіра батарэі Канстанціна Мецелева растлумачыў нам, што... нічога гэтага не было.

«Мне не давялося сустрэцца пасля вайны ні з Нінаю, ні з Батурам, ні з прафесарам, — прызнаўся гэты сумленны ўнутраны голас,— можа хто-небудзь з іх і вярнуўся з вайны, можа, Ніна выйшла замуж і змяніла прозвішча... не ведаю»...

А мы ж думалі, што ведае. А мы ж верылі... Хоць многае, праўда, выклікала ў нас сумненні...

Мы не знаёмы з творчай лабараторыяй аўтараў сцэнарыя фільма «Сорак мінут да світання» Р. Вікерса і А. Канеўскага. Мы не ведаем, як яны прыйшлі да гэтай тэмы, чым яна ім дарагая. Мы не ведаем, што прымусіла студыю «Беларусьфільм» і рэжысёра Б. Рыцарава ўзяцца за ўвасабленне такой тэмы на экране. Але калі мастак бярэцца за працу вялікую і цяжкую, дык, відаць, у яго сэрцы наспела неабходнасць расказаць людзям думкі, ім вынашаныя, выпакутаваныя, ператвораныя ў вобразы, у строй мастацкага твора... І вось мы знаёмімся з вынікам іх працы — мастацкім фільмам «Сорак мінут да світання»...

Напэўна, у творчым плане студыі фільм гэты анатаваўся як апавяданне пра нашых людзей, якія ў гады міру таксама, як і ў гады вайны, заўседы на перадавой, жывуць для народа, аддаюць сябе любімай справе... Магчыма, так аб дружбе, аб вернасці, аб тым, што тыя, хто аддаў жыццё за нас, заўсёды з намі...

Што ж, усё гэта словы правільныя і добрыя. Але за імі павінна стаяць справа — у дадзеным выпадку, мастацкая. Глядач глядзіць не анатацыю, а фільм...

Вядома, ідэя твора заўсёды шырэйшая за сюжэт. Мноства розных сюжэтаў могуць раскрываць адну, глыбокую і мудрую ідэю, памагаць вобразна данесці яе да гледача і чытача. Але зусім не кожны сюжэт прыдатны для гэтай важнай мэты, а толькі той, у якім увесь лад, падбор характараў, расстаноўка сіл, сам стыль — з найбольшай паўнатой, яснасцю і мастацкай перакананасцю раскрываюць думку, што ўсхвалявала аўтара, абараняюць яго пазіцыю.

Гэта зусім не азначае, што, знайшоўшы, так сказаць, ідэйны каркас, можна нацягваць на яго сюжэты, якія больш ці менш падыходзяць.

Але нельга з выпадковых гісторый, з выпадковага, неадабранага матэрыялу, адвольна скампанаванага і падагнанага пад абы-якую літаратурную форму, выцягваць ідэю — няхай правільную, патрэбную, дарагую нам усім. Часта гэта азначае прафаніраваць яе. Нам здаецца, фільм «Сорак мінут да світання» пабудаваны іменна на такой няправільнай сцэнарнай аснове. Ён фальшывы ў сваёй пачатковай задуме.

З першага кадра ў гледача ўзнікае недавер'е да таго, што адбываецца на экране, і яно не рассейваецца, калі загараецца святло... Таму што недакладная задума атрымала такое ж няяснае, прымітыўнае і наўмысна ўскладнёнае ажыццяўленне. Ніякія фармальныя выкрутасы і хітрыкі не могуць схаваць беднасць і надуманасць зместу... Думаецца, што папрок гэты да фільма можна было выказаць яшчэ тады, калі ён быў толькі сцэнарыем...

Чаму Канстанцін Мецелеў раптам, праз дваццаць гадоў, успомніў сваіх сяброў? Што здарылася ў яго жыцці такое, што прымусіла яго азірнуцца на мінулае і, больш таго — уваскрасіць, даць новае жыццё людзям, якія былі некалі з ім побач?

Прыгадаем п'есу К. Сіманава «Чацвёрты». Жывым сумленнем сталі тры сябры на шляху Чацвёртага ў самы складаны, крытычны момант яго жыцця, калі вырашаўся не толькі яго лёс, але лёс міру на зямлі, лёс чалавецтва. І хоць мы ведаем, што іх няма ў рэальным свеце, — яны для нас становяцца такімі ж жывымі, як для Чацвёртага, з іх непаўторнымі, рэзка акрэсленымі характарамі, суровым лёсам, памылкамі і ідэаламі, з іх моцнай унутранай сувяззю і перапляценнем жыццёвых дарог, з іх выверанай часам прамінлівасцю і мудрасцю...

А якая прычына была ў Канстанціна Мецелева? Магчыма, ён пайшоў на пенсію і вырашыў у вольны час праехацца па знаёмых месцах? А больш правільна, проста атрымаў ад аўтараў прызначэнне на ролю канферансье. І, як кожны канферансье, ён — асоба ў дзеянні амаль незацікаўленая, яго справа — звязаць нумары, няхай сабе выпадковымі інтэрмедыямі. Але яго ж вачыма мы бачым астатніх. Ад яго асобы, ад яго погляду на жыццё і на людзей залежыць увесь тон фільма, тое, што павінна скласці яго бачную плоць і яго найглыбейшы, патаемны падтэкст.

Аднак мы так і не даведаліся, што за чалавек гэты былы камандзір батарэі. Адзінае, што мы пасіяваем убачыць у ім за паўтары гадзіны экраннага дзеяння і за дваццаць гадоў дзеяння фільма — гэта паўнейшую яго душэўную вяласць і бяздзейнасць. З'явіўшыся да каханай жанчыны, ён з замілаваннем назірае яе сямейнае шчасце (дарэчы, вельмі дэкларатыўнае) і не спрабуе хоць неяк увайсці ў яе жыццё. Няхай бы маральная перамога над самім сабою, духоўная стойкасць даліся б яму цаною барацьбы, намаганняў — нічога гатага няма. Унутраны голас, праўда, нясмела заявіў: «Ты мне самы дарагі чалавек...» Больш ніяк барацьба абавязку і страсцей не праявілася.

Нам запярэчаць: Ніны ж няма, Канстанцін Мецелеў сам яе выдумаў, чаго ж ён будзе хвалявацца?

Але ж глядач па «арыгінальнай» задуме аўтараў да апошняга кадра пра гэта не ведае. Ён не ведае, навошта яму трэба глядзець на кірпатую дачку Ніны, якая вырашае пытанне аб першым каханні пры незнаёмым чалавеку, і выслухоўваць прапісныя ісціны наконт гэтага дастаткова даследаванага пачуцця. Яго хвалююць цяпер Ніна і Канстанцін, сталыя людзі, якія шмат перажылі і знайшлі адзін аднаго праз дваццаць гадоў...

Зрэшты, магчыма, і не хвалююць. На экране не адбываецца нічога такога, што б хвалявала. Праўда, рака затапляе недзе нейкія астравы,—але каму якая справа да астравоў і «закадравага» мужа Ніны, які знаходзіцца на гэтых астравах, калі ўся гэтая стыхія пададзена ў дзвюх-трох мімаходных рэпліках другарадных персанажаў. А потым Ніна доўга і мужна едзе ў аўтобусе, каб памагчы (як? —незразумела) свайму мужу...

Дык у чым жа сэнс першай навелы? Ніна хацела стаць піяністкай, а стала мужняй жонкаю?

Наўрад ці хацелі аўтары і рэжысёр прывесці гледача да гэтай думкі...

Следам за тым Мецелеў уявіў сабе калгас недзе ні то на Магілёўшчыне, ні то на Палтаўшчыне, і ў ім старшынёю — Батуру.

І тут ужо нам зусім робіцца нямка, таму што нашы мізэрныя, але ўвогуле добрыя ўяўленні аб былым ротным разведчыку і яго камандзіры пачынаюць мяняцца. У акопах Батура, хоць і весяліў салдат, але заяваў сур'ёзна, ішоў на смерць дзеля вялікай мэты. А мірнае жыццё і дзейнасць Рыгора Батуры, як іх уяўляе сабе Мецелеў па волі аўтараў, паўстаюць перад намі калейдаскопам павярхоўных, неразумных учынкаў. І гэта, мякка кажучы, лёгкадумнасць у вырашэнні складаных пытанняў жыцця пасляваеннай вёскі даходзіць да балаганнага дзеяння, калі стары дзед Дзямід, седзячы ў ванне, глядзіць тэлевізар, а па тэлевізару паказваюць, як змагаўся і паміраў Паўка Карчагін...

Ці патрэбна так груба, бестактоўна сутыкаць вялікае і смешнае? Самы радавы глядач не паверыць, што так уяўляюць сабе камунізм Рыгор Батура і Мецелеў... І непрыемна глядзець, калі дзед Дзямід, вылазячы з ванны, заяўляе, што без працы яму не жыццё, а перавыхаваныя Батурам хлопцы і дзяўчаты, ахвяраваўшы суботнімі танцамі, усе, як адзін, ідуць грузіць насенне...

Гэта гучыць пародыяй. Наўрад ці такое вырашэнне памагае аўтарам выказаць высокую свядомасць нашых людзей...

Не пашанцавала і Васілю Бродаву. Вакол яго Мецелеў таксама ўхітрыўся ўбачыць нейкіх дробных людзей, якія набілі аскому па газетных фельетонах: тут і яго калега, які баіцца смелых рэчаў (а смелымі яны здаюцца толькі аўтарам — Бродаў гаворыць некалькі агульных фраз пра тое, што юбілеяў шмат, а медыцына пакуль яшчэ бяссільная перад некаторымі хваробамі); тут і ўрач-перастрахоўшчык; і, вядома, стыляга-дармаед, які пакінуў дзяўчыну ў бядзе...

Прафесару Бродаву пашанцавала менш, чым прафесару Дронаву... І яму нічога не застаецца, як толькі дэманстраваць зададзеныя рысы станоўчага прафесарскага тыпажу — «А ну, бацюхна», буйныя рукі, стомленыя вочы і г. д.

Наўрад ці гэты набор банальнасцей створыць у гледача вобраз непрымірымага змагара і шукальніка...

Такім чынам разам з Канстанцінам Мецелевым мы ні то ўспомнілі, ні то прыдумалі яго сяброў... А зрэшты, адкуль мы ведаем, што яны яго сябры? Якую ролю яны адыгралі ў яго жыцці, і што даў ім ён? І што яны ўсе разам далі нам, гледачам? Чаму аўтары вырашылі выбраць іменна гэтых людзей і гэты лёс? І чаму зроблена гэта такім складаным шляхам— шляхам праекціравання мінулага на будучае? Навошта гэтыя туманныя здагадкі наконт таго, жывыя яны ці не? Навошта гэта ўпартае падкрэсліванне вельмі ўмоўнага прыёму, калі аўтары і рэжысёр, здавалася б, імкнуцца да падрабязнага, бытавога ўзнаўлення рэчаіснасці без мастацкага адбору і асэнсавання яе?

Усе гэтыя здагадкі ні да чаго нас не прыводзяць. Мы так і не даведаемся, да чаго б гэта...

Ясна толькі адно — невясёлую трансфармацыю перацярпела задума будучага твора ад непрадуманага яе ўвасаблення ў сцэнарыі і на экране.

Не выратаваў ўяўны, на першы погляд, арыгінальны фармальны прыём «успамінаў будучыні», працей кажучы, таго, чаго няма. Усё выпадкова, прыблізна — сцэны бою напоўнены прывычным грукатам, прывычнымі выкрыкамі: «Агонь! Нуль пяць, лявей!», ёсць абавязковы набор акопных тыпажаў, нават подзвігі, якія паспешліва здзяйсняюць героі таксама не свае, а ўзятыя напракат... І, вядома, гэтыя мітуслівыя пралогі зусім не ўспрымаюцца як запеў кожнага новага апавядання — таму што слушнага мы ні пра каго нічога не даведваемся...

Само апавяданне загружана празмернымі, дакучлівымі падрабязнасцямі, кожная навела ўключае ў сябе яшчэ адну, адвольна ў яе ўціснутую — пра дачку Ніны, пра дзеда Дзяміда, пра нейкую дзяўчыну з любоўнымі турботамі... Навошта ж няўмела і недарэчы карыстацца такім моцным прыёмам, які патрабуе вялікай філасофскай нагрузкі, калі не ўдаецца стварыць элементарную стройнасць і цэласнасць экраннага дзеяння?

Мы не супраць пошукаў формы, мы не супраць сустрэчы на сцэне, у кнізе ці на экране з людзьмі, якіх ужо няма, — не супраць казак Гофмана і ценю бацькі Гамлета, не супраць «адваротнага» паказу апошніх дзён жыцця Ліды Мацісавай у п'есе Кагоута... Але мы за тое, каб галоўным і вызначальным у мастацкім творы была глыбокая, вынашаная задума, яркія, самабытныя і дакладна выпісаныя характары, значнасць жыццёвага матэрыялу і мастацкага зместу.

Сам па сабе прыём у мастацтве нічога не дае. Няхай ён застаецца ў запісной кніжцы аўтара да пары да часу. На экраны ж павінен прыходзіць сталы, закончаны твор. Нельга неахайна ставіцца да вялікай тэмы, да вялікага мастацтва, да вялікага гледача.

НАД РАДЗІМАЙ ДЗІМІТРАВА — СОНЦА СВАБОДЫ

Дзевятае верасня!..

Гэты дзень стаў вялікім нацыянальным святам балгарскага народа. Дваццаць год назад балгарскі народ па закліку Камуністычнай партыі і Айчыннага фронту ўзняўся на ўсеагульнае ўзброенае паўстанне. Была скінута фашысцкая дыктатура, народ узяў уладу ў свае рукі.

Працоўныя Балгарыі сустракаюць слаўную гадавіну вялікімі дасягненнямі ва ўсіх галінах эканомікі і культуры. Абапіраючыся на ўсебаковую дапамогу вялікага Савецкага Саюза і ў супрацоўніцтве з іншымі сацыялістычнымі краінамі, балгарскі народ пабудаваў за кароткі час асновы сацыялізма, змяніў жыццё краіны.

Расце і квітнее новая балгарская культура, мастацтва, літаратура. Яны ўзбагачаюцца ўсё новымі і новымі творамі, якія расказваюць аб вялікіх зменах у жыцці народа, усталяванні сацыялістычных адносін у жыцці і працы.

Прапануем чытачу вершы некаторых балгарскіх паэтаў і апавяданне маладога празаіка Младэна Дзнева.

Нікола ВАПЦАРАЎ

ПЕРАДСМЯРОТНАЕ

Бязлітаснае мы вядзём змаганне.
Эпічнае, — калі сказаць высока.
Загіну я — другі на змену стане,—
і што тут значыць нейкая асоба!

Расстрэл, і за расстрэлам — чэрві,
Усё лагічна так і зразумела.
Але мы ўсе з табой
і ў бой свяшчэнны,
народзе мой, мы пойдзем разам
смела!

23.VII.1942.

Стэфан ЦАНЕЎ

РОЗДУМ

Кожны дзень
павінен быць пражыты,
як апошні.

Ты асуджаны судом на смерць —
заўтра ў пяць расстрэл.
Ты маеш часу —
роўна суткі.
Што ты зробіш з ім!

Марнатраўцы ўсе — віна папросяць.
Бязглуздыя — жанчын.
Хтосьці — верш яшчэ адзін напіша.
Баязліўцы ўсё захочуць разам,

Наймацнейшыя
на дзіва будуць сціплымі.
Сейбіт пастараецца засеяць
два дэкары жыта.
Маці пажадае нарадзіць.
Рабочы выкуе
апошні молат свой.

Вось і ўсё.
І большага няма, чым гэта —
ў свой апошні час зрабіць дабро
для іншых,
для жывых.

Пеньё ПЕНЕЎ

30 СТАЦІНАК

Сталоўку сваю
знае кожны рабочы —
тут у абед
шумнавата заўсёды:
прыходзяць,
палуднуюць,
а калі хто хоча —
можа выпіць піва
або крэмсоды.
Рэстаран
не для нашых рабочых леваў,
дзя нас —
выгадней несумненна
вось гэты буфет —
пры ўваходзе злева,
абсталяваны адменна.
Не азірайся,
не стой на месцы,
і часу не траць
дарма:
сам бяры,
што наважыў з'есці, —
буфетчыка
тут няма!
Парадак просты
даволі:
прадавец тут —
свая рука,
а другая рука —
у роті
кліента-пакупніка.
Насупраць скрыначка —
гэта
новая каса буфета.
Сам грошы кладзеш
і рэшту
бярэш,
калі трэба,
сам.
А кантралёрам найлепшым
служыць сумленне нам.
Сягоння ўвечары зноў прыйшоў я —
загадчык Давід
наўрэўся якраз.
Ківаю:
«Ну, як абарот грашовы!
Відаць,
разарыла ўжо скрыначка вас!»
А той — з абурэннем мне
і з дакорам:
—Так крыўдзіць людзей
— гэта проста сорам!
Несправядлівы ты, — кажа, — да іх.
Няёмка стала,
хоць кайся.
Растраты ніякай.
А ўчора Давід
распіску знайшоў у касе.
Трымаю паперку перад сабой
чытаю —
вачам аж горача:
«Дзесяць стацінак яшчэ за мной»
і подпіс пастаўлены хораша.
Відаць,
з сабою было малавата
грошай у тую хвіліну.
Але —
хіба выяўлена растрата!
Вось —
распіску рабочы пакінуў!

Весялін ХАНЧАЎ

Рамансеро пра Хосе Санча

Хосе Санча,
Хосе Санча,
я цябе шукаю, клічу,
каб пагутарыць
з табою,
любы дружа і мастра.
Пасівелы на вакзалах,
пастарэлы ад спатканняў,
дваццаць пяць гадоў бяздомных
ты па ўсёй зямлі вандруеш.

Адкажы,
чаму ж не можаш
маляваць яе праўдзіва!

Адкажы,
чаму малюеш у маіх фракійскіх
хатах
не харо, але фламенка
і мадоннаў,
Хосе Санча!

Адкажы,
чаму малюеш поўнач колерам
чырвоным,
сінім,
бэзавым,
зялёным,
а ў вачах яе тубыльцаў
немы крык тугі цыганскай!

Адкажы,
чаму малюеш ты быкоў ля мутнай
Сены,
залатыя кастаньеты
у варшаўскім небе сінім!

Адкажы,
чаму малюеш немак смуглымі
такімі
пад карменаўскай мантыллай,
і чаму квітнеюць ружы
у панурым гарадку іх!
Адкажы,
чаму малюеш кіпарысы і масліны
побач з рускаю бярозай!

Адкажы,
чаму малюеш ты маю дачку
з вачыма,
як вялізныя дзве ночы
ці кінжалы два з Толеда!

Хосе Санча,
Хосе Санча!

Ты маўчыш.
Ты не гаворыш.

Пасівелы на вакзалах,
пастарэлы ад спатканняў,
дваццаць пяць гадоў бяздомных
ты па ўсёй зямлі вандруеш,
і на ўсіх чужых перонах
сходзіш ты ў сваёй Іспаніі,
і пры кожнай новай стрэчы
бачыш ты сваю Іспанію,
і па ўсёй зямлі малюеш
толькі
родную Іспанію.

Я цалую твае вочы,
Хосе Санча,
Хосе Санча.

Давід ОВАДЗІЯ

***

І пішацца гісторыя крывёй...
Я думаў, гэта—фраза, і не болей.
Але душа сто раз зайшлася болем,
але забрала смерць маіх сяброў,
і мой білет зафарбавала кроў...

Я ў праўду гэтых простых слоў
паверыў,
калі мы йшлі пад кулямі наперад—
не дзеля славы і багацця йшлі,
калі расстрэльвалі нас, калі
гісторыю пісалі мы крывёй.

Андрэй ГЕРМАНАЎ

КРАМІКАЎЦЫ

Зямля цвярдая,
як далонь,
што век арала і касіла,
і сівер знала, і агонь,
і поўна ўся жалезнай сілы.

Яшчэ ў далёкія часы
тут з долу іскры выкрасалі,
і нават сінія лясы
з іржавым лісцем вырасталі.

Жыццё цякло за векам век,
не палымнела — тлела ледзьве.
Не ведаў мудры чалавек,
што нарадзіўся на жалезе.

Але жаданы час прабіў:
і буры камень на раўніне,
што сотні год няшчасцем быў,
балгарскай сталлю хутка хлыне.

Іскра, з якой мы пачалі,
зарой успыхне небывалай.
І стане, стане вечнай славай
праклянце вечнае зямлі!

Пераклады з балгарскай мовы
Ніла ГІЛЕВІЧА.

Младэн ДЭНЕЎ

ВЯСЕННІ ВЕЦЕР

АПАВЯДАННЕ

Сяляне з гэтай вёскі расказвалі, што Іван Гярдэмаў — перасяленец. Многа гадоў назад яго бацька і маці прыйшлі сюды з Гярдэмы — далёкай вёскі на чарнаморскім узбярэжжы. Людзі помнілі, што ў маці былі прыгожыя іскрыстыя вочы, і што яна часта спявала сумныя песні. Іван атрымаў у спадчыну ад сваіх бацькоў дзве рэчы — прозвішча ад бацькавай вёскі і неспакойную кроў ад маці. Магчыма, з гэтай прычыны ён часам, пасля чаркі, пачынаў спяваць матчыны сумныя песні пра таямнічыя зялёныя лясы і сінія горы, пра далёкія шляхі-дарогі...

Іванава жонка слухала гэтыя песні ўжо трыццаць год і ўсё дзівілася: што гэта з мужам? А ён спяваў таму, што з песняй яму было лягчэй жыць, лягчэй працаваць...

Кожную раніцу ён мыўся на двары пад калонкай, голы да пояса. Бо быў упэўнены, што калі адзін дзень не памыецца на двары, тады плечы яго апусцяцца, рукі пакрыюць глыбокія зморшчыны... Душа ў яго была такая ж маладая, як і пяцьдзесят год назад.

Іван Гярдэмаў меў прыгожую для сваіх год постаць і настол адчуваў моц у плячах, руках, ва ўсім целе.

Ён мыўся, падставіўшы патыліцу пад самы кран і доўга цёр шыю і плечы з абодвух бакоў рукамі. Халодныя кроплі прыемна казталі яго валасатыя плечы. Пасля накідваў на плечы ручнік, запальваў цыгарэту і доўга глядзеў на горы, дзе быў горад і дзе жылі ягоныя двое дзяцей.

Горад не быў відзён, але ён уяўляў яго чыстыя вулачкі, вымытыя тратуары і зялёныя садкі.

«Добра жыць у горадзе, — думаў з некаторай зайздрасцю ён,—вуліцы там ім патрэбны, відаць, для шпацыру, таму яны такія забрукаваныя, на пустырах усюды—садкі, а мы тут спім у шапку... Хіба нельга і ў нас насадзіць кветак, каб чалавек, ідучы з работы, пастаяў, пацешыўся... Ды і магазіны ў горадзе лепшыя за тутэйшую краму, дзе прадавалі стары паркаль, цвікі і розную драбязу...

Іван Гярдэмаў быў каменячосам і мулярам. Сваімі дужымі рукамі з шырокімі далонямі ён перакідаў за доўгае жыццё многа камення. Але ён зусім не ўмеў расказваць. На сходах заўжды садзіўся на апошнюю лаўку, панура ўцягваў галаву ў плечы, каб людзі не бачылі яго і не кпілі. Перад кожным сходам даваў сабе слова, што абавязкова ўстане і скажа і пра садкі, і пра вуліцы, і пра кветкі... Але калі старшыня пытаўся, хто жадае выступіць, ён яшчэ больш хаваўся за спіны людзей, баючыся глянуць наперад.

— Нельга болей цярпець!—мармытаў Гярдэмаў.—Трэба будзе сказаць ім...

— Іване, ты з кім размаўляеш?—азвалася жонка з пакоя, адчыніўшы акно і высунуўшы сваю маленькую галаву.

— Н і з кім я не размаўляю, — сказаў ён, азірнуўшыся.—І ні з кім не збіраюся гаварыць...

Яна не разабрала яго апошніх слоў, высунулася яшчэ больш і перапытала:

— Што ты сказаў?

— Ат, нічога...

Іван Гярдэмаў саромеўся гаварыць на людзях. Прыгожыя прыступкі, якія ён зрабіў, чарапічныя дахі, новыя дамы—усё гэта было мацнейшае і красамоўнейшае, чым словы, якія ён хацеў сказаць людзям.

А ў яго самога быў стары дом. Такі стары, што калі налятаў вецер, кроквы рыпелі, а крайнія чарапічыны падалі на зямлю і разбіваліся на кавалкі.

Уначы ён часта ляжаў на спіне і моўчкі слухаў, як рыпяць кроквы.

Аднойчы старшыня прапанаваў яму разбурыць гэты дом, таму што ён псуе выгляд усёй вёскі.

Неўзабаве пасля той гаворкі старшыня пераехаў у горад, дзе ў яго быў новы дом. Іван будаваў той дом. На тры пакоі, з ваннай, з камінам...

«Калі я пабудую сабе новы дом,—думаў Іван,— дык зраблю абавязкова камін. Мае ногі і рукі ўвабралі многа холаду, і я павінен выгнаць яго...»

Ногі яго сапраўды набраліся холаду, таму што сяляне звычайна будавалі сабе новыя дамы толькі напрадвесні і толькі позняй восенню, калі адпачывалі ад зямлі і зямля адпачывала ад іх. У Гярдэмава быў нейкі фартух са свіной скуры, але вецер забіраўся і пад яго і студзіў ногі. Многа разоў яго ногі дрыжэлі ад холаду, але Іван не мог пакінуць працы. Бо кожны чалавек прыйшоў на гэты свет, каб зрабіць нешта, а Іван Гярдэмаў прыйшоў, каб будаваць дамы.

Неяк уначы, лежачы побач з жонкай, ён надумаў падлічыць, колькі пабудаваў новых дамоў. Выходзіла, што акрамя чыгуначнага стрэлачніка, акрамя дзеда Горчы—званара, уся вёска спала пад яго дахамі.

«Толькі наш дом і царква старыя»,—падумаў Гярдэмаў і засумаваў.

Потым устаў, накрыў жонку коўдрай, выйшаў на двор і доўга глядзеў на агні горада. Сеў на калоду і закурыў. Трэскі вакол калоды былі пабелены інеем і свяціліся ў цемры, як сярэбраныя.

Жонка прачнулася, абмацала ложак і, пераканаўшыся, што Івана няма, адразу спалохалася. Накінула Іванава паліто на плечы і таксама выбегла.

— Іване, дзе ты?

— Я тут...

Яна падсела і прыціснулася да яго.

Перад імі, як груда камення, узвышаўся іх дамок.

— Давай рэзбурым, Іване, гэты дом, пабудуем новы... Гэта ж ясна, што нашы дзеці не вернуцца ў такі.

Яна хацела сказаць: «Гэта ж ясна, што дзеці не хочуць вяртацца», але ведала, што гэта толькі яшчэ больш сапсуе мужу настрой.

Месяц выплыў з-за дрэў і асвяціў ціхую вёску. Іван Гярдэмаў глядзеў на дамы, якія ён пабудаваў і якія цяпер былі для яго чужымі... Дастаў цыгарэту і ізноў закурыў.

— Можа, вернемся у наш край? — сказаў Іван і цяжка ўздыхнуў. Агеньчык цыгарэты ўспыхнуў, стаў ярчэйшым.

— Я не магу пакінуць гэтую зямлю, Іване. Маці і бацька мае тут пахаваны.

Яна сціснула яго руку, быццам не хацела адпускаць яго адсюль.

— У гэтай вёсцы, — сказаў Іван, — нешта цяжка мне працуецца.— Не падабаецца мне тутэйшы старшыня, не дбае ён пра людзей...

— Ды цішэй ты, — зашаптала старая. — Яшчэ хто-небудзь пачуе...

— Дык што, калі і пачуе? Хіба гэта няпраўда? Тут працуе, а дом мае ў горадзе... Адна нага тут, другая там. Хіба я не бачу? А ў нашых краях не так. Помніш, мы былі там летась, які сад цудоўны там! Пераедзем, га?

— І не крануўся з месца!—жонка павысіла голас і пабудзіла курэй на седале пад паветкай. Прачнулася і свіння ў хляве, парохкала і зноў замоўкла.

— Не крануся!

Яна рушыла ў хату і знікла ў змроку.

Блізіўся ранак, на двары стала халаднавата.

Іван Гярдэмаў пайшоў у цёплы пакой, прылёг зноў. Абое доўга маўчалі. Цёплай шурпатай далонню ён выцер слёзы на жончыных вачах. А на двары дзьмуў вясенні вецер. Гярдэмаў слухаў, як рыпяць кроквы, і думаў, што ён вельмі стаміўся. Стаміўся так, як бывае стомлены напрадвесні чалавек ад доўгай спюдзёнай зімы. Але Іван ведаў, што вясенняя стома заўжды хутка знікае. Сонца сагравае кроў, і стома растае, як той снег, які застаецца пад платамі, счарнелы і зледзянелы, нібы ён намагаецца дачакацца другой зімы.

Кроквы стомлена рыпелі. Хто ведае, колькі яшчэ часу яны цягнулі б сваю песню...

Аднойчы раніцою нехта пагрукаў у браму. Гярдэмаў прыўзняўся, прыслухаўся.

— Гэй, Іване! Гэй, дзядзька Іване!

Гярдэмаў гучна кашлянуў, даючы знак, што зараз выйдзе. А жонцы сказаў:

— Новы старшыня. Шукае мяне, каб адраманта ваць склад.

Старая здзівілася: адкуль ён ведае, чаго прыйшоў новы старшыня? Яна адчыніла акно і высунулася. Як і кожная жонка, старая заўсёды цікавілася справамі свайго чалавека.

— Вось які клопат, дзядзька Іване...

— Ведаю, склад! — сказаў Гярдэмаў спакойна.—Вось зараз паклічу Васка і пойдзем.

— Не, дзядзька Іван, пачакай...

Недзе непадалёку дзынкнула медная накрыўка бідона, а потым зарыкала карова. Відаць, яе пачалі даіць.

Гярдэмаў уважліва глядзеў на старшыню. Твар у таго быў малады — даўгаваты і ружовы, як у дзяўчыны.

— Ну, дык што здарылася? — з нецярплівасцю спытаў ён. — Можа, зойдзем да мяне?

— Няма часу, дзядзька Іване, я спяшаюся. Учора жонка кажа мне: Гярдэмаў добры майстар, варта яго паклікаць. Дом хочам ставіць. У брата жыць цеснавата... Дык вы прыйдзеце, дзядзька Іване?

Гярдэмаў трымаўся за паркан, глядзеў на юнака, які стаяў перад ім. Яму здалося, што ён бачыць першы раз старшыню. Дагэтуль сустракаў яго многа разоў, а быццам і не ведаў, які ён з выгляду. Заўважыў цяпер, што ў яго худы, адкрыты, з чорнымі бровамі твар. Паміж пярэднімі зубамі была вялікая шчарбіна.

— Дык вы прыйдзеце, дзядзька Іване? Якраз учора я атрымаў будаўнічы план ад тэхніка.

— Іду! Зараз жа іду! Жонка, дзе мой куфэрак?..

З-за горнага хрыбта выкацілася сонейка, разагнала змрок. Адразу пацяплела. У такія вясенніх дні мужчынам хочацца ўскочыць верхам на гарачага каня, з жанчынам — саджаць кветкі.

Пераклаў з балгарскай мовы
Ванкарэм НІКІФАРОВІЧ.

З КІНАКАМЕРАЙ ПА РЭСПУБЛІЦЫ

«Савецкая Беларусь» № 20

Мінская кінастудыя навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных фільмаў выпусціла на экраны рэспублікі чарговы, дваццаты, нумар часопіса «Савецкая Беларусь».

Часопіс пачынаецца сюжэтам пра мітынг рабочых-аўтазаводцаў, прысвечаны 20-годдзю з дня заснавання завода. Другі сюжэт у часопісе расказвае аб міжрэгіянальным семінары ААН, які праходзіў у Мінску.

Шахцёры Салігорска сустрэлі сваё свята — Дзень шахцёра—новымі працоўнымі поспехамі. Асабліва вызначылася ў працы брыгада камуніста В. Пінчука. Аб гэтай брыгадзе расказвае чарговы сюжэт.

У кадрах кіначасопіса адлюстравана цёплая сяброўская сустрэча польскіх харцэраў з беларускімі піянерамі, рэспубліканскія спаборніцтвы па суднамадэлізму.

Часопіс заканчваецца паказам выступлення артыстаў цырка краін народнай дэмакратыі.

Малюнкі А. РЭПІНА і Л. ДОЛМАТА



Без слоў...

Без слоў...

Выпраўляла маці сына ў тэатр...
— Ты ж глядзі, сынок, там «мазіла» і «на мыла» крычаць нельга... Там можна толькі «біс» ці «аўтара».

ВЕСТКІ З МУЗЕЯЎ

ЯНЫ ЗМАГАЛІСЯ ЗА БАРЫСАЎ

Фонды Барысаўскага краязнаўчага музея ўвесь час папаўняюцца новымі экспанатамі і дакументамі гадоў Вялікай Айчыннай вайны. Многія з іх экспануюцца. Так, напрыклад, на стэндзе «Ніхто не забыты, нішто не забыта» з'явіліся вельмі цікавыя рэчы і фотаздымкі. Вось невялічкі кавалак чырвонага матэрыялу. На ім алоўкам напісана прывітанне барысаўчанам. Гэта — вымпел. Яго скінулі савецкія лётчыкі з бамбардзіроўшчыка ў дні вызвалення горада ад фашысцкіх захопнікаў. Стала яшчэ вядома, што скінула яго лётчыца жаночага бамбардзіровачнага палка М. Доліна, якая нядаўна наведала Барысаў. Яна расказала многа цікавага аб вызваленні беларускай зямлі ад фашыстаў.

Экспануецца на стэндзе фотаздымак жыхаркі горада М. Жук. Гэта яна выратавала жыццё параненаму танкісту лейтэнанту Бахараву. Ён са сваім экіпажам мужна абараняў мост цераз Бярэзіну. Бахараў нядаўна таксама прыязджаў у Барысаў.

Перададзены музею і фотаздымак сакратара падпольнага райкома партыі І. Яраша, які загінуў у гады вайны.

Працягваецца збор матэрыялаў аб партызанах-падпольшчыках, якія дзейнічалі ў Барысаўскім раёне.

ЦІКАВЫ ЭКСПАНАТ

Вечарам на адной з вуліц Гомеля хлапчукі гулялі з нейкім вялікім металічным нікеліраваным прадметам. Гэта прыцягнула ўвагу жыхара горада М. Патоцкага, які праходзіў міма. Выявілася, што ў дзяцей быў масіўны фамільны штамп княгіні І. І. Паскевіч. Са згоды школьнікаў М. Патоцкі перадаў каштоўную знаходку Гомельскаму абласному краязнаўчаму музею.

Штамп уяўляе сабой невялікую прыладу, нешта накшталт штэмпельнага станка, зробленага з металу, добра аднікеліраванага, з вялікай драўлянай ручкай. Вышыня яго — 25 см, шырыня — 10 см, у сярэдзіне — медны барабан з лічбамі і літарамі для адбітку даты. — дня, месяца і года. У штамп умела ўстаўлена падушка для змазвання, якая аўтаматычна дзейнічае, калі націснуць ручку.

Апошні адбітак штампа зроблен 16 сакавіка 1914 года.

Экспанат, дастаўлены ў музей, цікавы як прадмет паліграфічнай тэхнікі пачатку 20-га стагоддзя.

М. ГАТОЎКІН.

«ТРАМВАЙНЫ МАРШ»

На вокладцы, пажоўклай ад часу, — прыгожа намаляваны трамвай. Невядомы мастак зрабіў гэты малюнак у чэрвені 1898 года. Захаваўся выразны надпіс — «Старшыні таварыства Віцебскага электрычнага трамвая». На другім аркушы — ноты. Зверху — прозвішча аўтара твора: А. Крамер.

Гэты невялічкі падарунак прыслаў Віцебскаму абласному краязнаўчаму музею жыхар Масквы Уладзімір Хібекель. У сваім пісьме ён паведаміў, што «Трамвайны марш» быў напісаны самадзейным кампазітарам А. Крамерам у сувязі з пускам у Віцебску трамвая і быў вельмі папулярны ў віцяблян. Тэкст маршу, на жаль, не захаваўся. Работнікі музея паказалі ноты мясцовым аматарам музыкі і тыя выканалі яго. Марш аказаўся цікавым музычным творам і будзе экспанавацца ў музеі.

УСПАМІНЫ ПРА ПАЭТА

Літаратурны музей Якуба Коласа атрымлівае пісьмы, фатаграфіі, дакументы, успаміны пра народнага песняра. Пісьменнік І. Барашка, які жыве ў Маскве, прыслаў музею ўспаміны пра Якуба Коласа, у якіх расказваецца аб сустрэчах паэта з чытачамі, аб тым, як ён працаваў над творамі «Новая зямля», «Сымон-музыка», «У палескай глушы».

З Масквы ў музей паступілі таксама ўспаміны пра Якуба Коласа ад генерал-лейтэнанта інжынерных войск у адстаўцы, кандыдата ваенных навук, дацэнта Я. Леашэні. Ён сустракаўся некалькі разоў з Якубам Коласам у Ташкенце, дзе пісьменнік знаходзіўся ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Побач са шматлікімі фактамі аб жыцці, творчай і грамадскай дзейнасці Я. Коласа ў Ташкенце Я. Леашэня расказвае, як у лютым 1943 года паэт прыняў удзел ва ўрачыстым выпуску афіцэраў Ваеннай акадэміі, што ад'язджалі на фронт. Ён выступіў на вечары з прамовай.

Гэтыя ўспаміны будуць уключаны ў кнігу матэрыялаў аб жыцці і творчасці Якуба Коласа, якую рыхтуюць да друку супрацоўнікі музея.

М. ЖЫГОЦКІ.

НА СТАРАЖЫТНЫМ ПАСЕЛІШЧЫ

Экспедыцыя Беларускага дзяржаўнага гісторыка-краязнаўчага музея закончыла раскопкі ніжняга замка ў Віцебску. Шматлікія экспанаты, выяўленыя на пасадскім месцы, расказалі многа цікавага. Так, напрыклад, пацвердзілася думка, што Віцебск такога ж «узросту», як і Полацк, і мае 1 100-гадовую гісторыю. Больш таго, яшчэ ў VIII—IX стагоддзях на месцы Віцебска былі паселішчы славян, якія з часам зліліся і ўтварылі горад. Археолагі знайшлі пацеркі, рэчы вытачаныя з костак і бурштыну, наканечнікі стрэл, хатнія прылады.

Экспедыцыя праводзілася пад кіраўніцтвам навуковага супрацоўніка сектара археалогіі Інстытута гісторыі Акадэміі навук БССР Г. Штыхава.

НОВАЕ ПАМЯШКАННЕ

Да апошняга часу Слуцкі краязнаўчы музей знаходзіўся ў цесным непрыстасаваным памяшканні. І вось нядаўна музей перабраўся ў асобны будынак. У шматлікіх залах абсталёўваецца экспазіцыя. Яны прысвечаны гісторыі Случчыны, расказваюць пра флору і фауну краю.

Будзе адкрыты новы аддзел—мастацтва. Яго экспанаты—каля 600 карцін, пейзажаў, малюнкаў савецкіх мастакоў, якія прыслалі іх у падарунак музею. У гэтым жа аддзеле будуць выстаўлены работы народных умельцаў: разьба па дрэву, ткацтва, вышыўка, а таксама сусветна вядомыя слуцкія паясы.

М. ТАРАСІКАЎ.

АПАЗНАНА КАРЦІНА ВЕРАНЕЗЕ

У музеі імя Брукентала ў Сібіу—адным са старых культурных цэнтраў Румыніі — нядаўна была апазнана карціна «Галоўка дзіцяці» славутага італьянскага мастака Паола Веранезе (1528—1588 гг.). Гэтая карціна, якая знаходзілася ў музеі сярод не падпісаных і яшчэ не апазнаных палотнаў, была набыта 200 гадоў назад у Вене заснавальнікам гэтага музея баронам Самуэлем фон Брукенталам як твор Тыцыяна.

У выніку вялікай работы, праведзенай спецыялістамі музея пад кіраўніцтвам загадчыка карціннай галерэі Тэадора Іанеску, устаноўлена, што палатно «Галоўка дзіцяці» напісана Веранезе. Па ўсёй верагоднасці, гэта — захаваны фрагмент вялікага твора славутага італьянскага мастака.

За апошнія гады, паведамляе агенцтва Аджэрпрэс, сярод палотнаў музея імя Брукентала было апазнана некалькі вельмі каштоўных карцін работы Тыцыяна, Ван-Дэйка, Анжыбале Карачы, Агасціна Карачы.

ТАСС.

НАВАСЕЛЛЕ ПОМНІКАЎ

У зоне стварэння новага грузінскага вадасховішча — «Сіонскага мора» на паўднёвым схіле хрыбта Малога Каўказа ля берагу горнай ракі Іоры быў знойдзены рэдкасны гістарычны помнік — Ціянецкі манастыр.

Ва Упраўленні выяўленчага мастацтва і захавання помнікаў культуры Грузіі карэспандэнту АДН расказалі:

— Спецыялісты-археолагі адносяць гэтую знаходку да VIII—IX стагоддзя. Пры дэталёвым вывучэнні і далейшых раскопках знойдзена таксама невядомая грабніца, якая мае вялікую навуковую цікавасць. Значэнне гэтых старажытных помнікаў настолькі вялікае, што было вырашана перанесці іх з зоны затаплення ў іншае месца. Для гэтага трэба было знайсці раён, падобны па сваёй прыродзе і рэльефу да мясцовасці, дзе знайшлі храм. Найбольш падыходзячым аказаўся раён вядомага Джварскага крыжовага манастыра VI стагоддзя паблізу старажытнай сталіцы Грузіі Мцхета, прыблізна ў ста кіламетрах ад «Сіонскага мора».

Цяпер разабраны помнік перанесены ў раён Джварскага манастыра і хутка пачнецца яго зборка на новым месцы. Работа гэтая будзе працягвацца паўтара года.

АДН.

НАШ МІЖНАРОДНЫ КАМЕНТАРЫЙ

Амерыканскія ваенныя самалёты, накіраваныя ўрадам ЗША ў дапамогу Чомбэ для барацьбы з паўстанцкім рухам кангалезскіх патрыётаў, абстрэльваюць і няспынна бамбяць горад Альбертвіль і іншыя раёны Паўночнай Катангі. Звыш тысячы бежанцаў з Конга, як паведамляе карэспандэнт агенцтва Франс Прэс, перасеклі возера Танганьіка ў пошуках прытулку.

Гнутнасць Чомбэ ў кангалезскім пытанні.

Мал. Ул. БАРАНОЎСКАГА.

АПАРАТ, ЯКІ ЧЫТАЕ

У Кіеўскім філіяле Усесаюзнага навукова-даследчага Інстытута паліграфічнай прамысловасці па спецыяльных відах друку ў лабараторыі электрафізікі зроблены цікавы апарат—своеасаблівая «кніга, якая гаворыць». Прыбор распрацаваны і сканструяваны навуковай супрацоўніцай Дзінай Ямпольскай.

Уключаем апарат—і перасоўны ўказальнік пачынае рухацца ўздоўж старонкі з англійскім тэкстам, умацаванай на панелі. Адначасова голас дыктара чытае радок за радком, прычым з фанетычна дакладным англійскім вымаўленнем.

Апарат працуе па прынцыпу магнітафона, але запіс тэкстаў робіцца не на стужцы, а на прамавугольных ферамагнітных лістах цёмна-карычневага колеру. Запіс кладзецца на плёнку круг за кругам. Тры галоўкі, якія рухаюцца паступальна і адначасова круцяцца, «чытаюць» запіс, пры гэтым зрокавае і слыхавое ўспрыманне вывучаемага тэксту поўнасцю сінхроннае. Можна, пераключаючы спецыяльны рычажок, размешчаны ў бакавой сценцы корпуса, спыніць «чытанне», даць ход назад і вярнуцца да любога радка для паўтарэння.

— «Кніга, якая гаворыць», — расказаў карэспандэнту АДН дырэктар філіяла Аляксей Наканечны, — вельмі зацікавіла спецыялістаў. Добрыя водгукі далі, у прыватнасці, выкладчыкі Кіеўскага дзяржаўнага універсітэта імя Тараса Шаўчэнкі. Гэты апарат пры серыйным выпуску значна палегчыць засваенне замежных моў, выпрацоўку правільнага вымаўлення. Прычым у апарат могуць устаўляцца лісты з запісам тэкстаў не толькі на англійскай, але і на любой іншай мове. Апарат можна таксама выкарыстаць для навучання сляпых.

АДН.

«ТЕАТР» № 9

Вераснёўскі нумар часопіса «Театр» шырока асвятляе тэатральнае жыццё краіны. Артыкул С. Расадзіна «О, час рэзкі мой...» прысвечаны разгляду спектакля Маскоўскага тэатра імя Ленінскага камсамола «Да пабачэння, хлопчыкі!». А. Уладзімірава расказвае пра спектакль Ленінградскай аперэты «Сэрца балтыйца». Пра пастаноўку п'есы індыйскага драматурга Б. Гарга «Сонні і «Махіваль» у Ленінабадскім музычна-драматычным тэатры піша Я. Угрыновіч. І, нарэшце, пра спектакль Хабараўскага тэатра юнага гледача — «Рэмбранд» Д. Кедрына піша К. Крывіцкі.

«Галасы нашых дзён» — так называюцца нататкі Г. Дубасава аб мінулым тэатральным сезоне Масквы. Часопіс друкуе агляды артыкул В. Сахноўскага «Ленінградская афіша». Серыя аглядаў мінулага сезона завяршаецца артыкулам сакратара Краснадарскага прамысловага крайкома КПСС Г. Кінелева «Кубань тэатральная». Да іх прымыкаюць артыкул І. Мяккавай «Хто шукае...» — аб гастролях у Маскве Узбекскага акадэмічнага тэатра драмы імя Хамзы і нарыс М. Злобінай «Астраханскія вечары».

Армянскі драматург Гурген Баран прысвяціў свой нарыс памяці выдатнага армянскага артыста Вагаршана, пяцігоддзе з дня смерці якога адзначала нядаўна тэатральная грамадскасць.

У раздзеле «Эстрада» — артыкул М. Хрусталёва аб эстрадным танцы.

Драматург Л. Малюгін на гэты раз выступае ў якасці гісторыка, публікуючы артыкул аб лёсе чэхаўскай «Чайкі».

Працягваецца публікацыя мемуараў Міхаіла Жарава.

У нумары дзве п'есы — «Трывожнае шчасце» К. Фіна і аднаактоўка А. Сцяпанскай «Гісторыя хваробы».

Шмат старонак адведзена хроніцы тэатральнага жыцця краіны.

У раздзеле «Зарубежны тэатр» — артыкулы Ул. Піменава аб паездцы ў Італію і Н. Крымавай — аб паездцы ў Англію, П. Маркава аб гастролях у Маскве Генуэзскага тэатра Стабіле.

Нумар завяршаецца публікацыяй спісаў творчага складу тэатраў краіны.

ЗАГАДКІ СКІФСКАГА МАСТАЦТВА

Леў напаў ззаду на дзікага казла. Пярэднімі лапамі ён абхапіў яго круп, магутныя сківіцы раздзіраюць спіну. Апошнім, адчайным рыўком казёл спрабуе вырвацца з ільвіных абдымкаў... Алень, закінуўшы галаву з галінастымі рагамі, падкурчыўшы ногі, нясецца ў імклівым галопе... Пантэра прыпала перад скачком на пярэднія ногі; арол лунае з распасцёртымі крыламі, грыфоны — фантастычныя крылатыя жывёліны з целам ільва і галавою ільва або арла.

Гэта своеасаблівае высокае мастацтва, у якім галоўным матывам з'яўляецца паказ жывёлы, было адкрыта крыху больш за сто гадоў назад, калі археолагі ўпершыню пачалі раскопваць скіфскія курганы—пахавальныя помнікі старажытнага народа, які жыў у Паўночным Прычарнамор'і.

Скіфы рабілі далёкія паходы ў Пярэднюю Азію, даходзілі да Сірыі і Егіпта. У сваіх родных прычарнаморскіх стэпах яны разграмілі персідскага цара Дарыя, што задумаў пакарыць скіфаў, у IV стагоддзі да нашай эры стварылі магутную дзяржаву, гандлявалі з грэчаскімі калоніямі ў Крыме. У гісторыі гэтага народа ёсць яшчэ шмат хвалюючых, нявырашаных загадак. Адной з іх з'яўляецца загадка скіфскага мастацтва.

Скіфскае мастацтва было, пераважна, прыкладное. На троўках нажоў, на збанах, на бронзавых люстрах, на зброі і конскай збруі адлюстроўваліся розныя звяры або асобныя часткі іх цела. Скіфы любілі паказваць дужых жывёлін, асабліва драпежнікаў: ільва, пантэру, мядзведзя, арла. Слабыя і дробныя жывёлы ў іх мастацтве не сустракаліся, а ў малюнках траваедных падкрэслівалася іх сіла. Напрыклад, капыты аленя паказваліся як сродак нападу, барацьбы. Таму яны маляваліся выцягнутыя і вострыя.

Гэта было мастацтва, у якім пераважалі стылізацыя і перабольшанне. Але даволі моцны ў ім быў і рэалістычны струмень. Алень з падагнутымі нагамі, улюбёны матыў скіфскага мастацтва, доўга здаваўся нерэалістычным. Потым заўважылі, што стан ног у яго дакладна адпавядае позе лятучага галопу. Скіфскія мастакі простым вокам бачылі тое, што мы адкрылі толькі з дапамогаю імгненнай фатаграфіі.

Скіфскае мастацтва паяўляецца неяк раптам, адразу, ужо амаль у сфарміраваным выглядзе, з гатовым наборам сюжэтаў у VII—VI стагоддзях да нашай эры. Яго вытокі нам невядомыя. Іх доўгі час шукалі ў Паўночным Прычарнамор'і, на ўласна скіфскай тэрыторыі, але без поспеху. Археолагі так і не знайшлі ніводнай рэчы, якая была б упрыгожана ў «звярыным стылі» (так у навуцы называюць характэрную рысу скіфскага мастацтва) і датавалася б раней VII стагоддзя нашай эры.

Затое выявілася іншае. Аказваецца, скіфскае мастацтва зусім не было толькі скіфскае. Суседзі скіфаў, што жылі на Паўночным Каўказе, у лесастэпавай Украіне, па Волзе і далей на ўсход, таксама адлюстроўвалі на сваёй зброі, упрыгожаннях і іншых рэчах тых жа жывёлін і ў такіх жа мудрагелістых позах. А потым і ў Заходняй Сібіры, у Мінусінскім краі, была знойдзена вялікая колькасць прадметаў з бронзы, што былі ўпрыгожаны такімі ж своеасабліва стылізаванымі фігурамі аленяў, дзікоў або драпежнікаў, якія палююць на траваедных.

Сёння ясна ўжо, што на ўсім вялікім поясе еўразійскіх стэпаў, ад Дуная да Паўночнага Кітая, дзе ў другой палавіне І тысячагоддзя да нашай эры жылі скіфы і блізкія да іх па паходжанню і культуры вандроўныя плямёны, было распаўсюджана аднолькавае выяўленчае мастацтва. Выключэннем доўгі час была Сярэдняя Азія. Археолагам ніяк не ўдавалася знайсці там адлюстраванні жывёлы, падобныя да скіфскіх. А, між тым, па многіх ускосных дадзеных можна было меркаваць, што ў старажытных народаў Сярэдняй Азіі таксама існаваў і дасягнуў вялікай дасканаласці «звярыны стыль» у выяўленчым мастацтве. Толькі ў самыя апошнія гады гэта абстрактнае заключэнне пацвердзілася фактамі. Харэзмская археолага-этнаграфічная экспедыцыя пад кіраўніцтвам Сяргея Талстога, даследуючы могільнікі Тагіскен і Уйгарак, на сярэдняй Сыр-Дар'і, знайшла ў іх прадметы конскай збруі, упрыгожаныя адлюстраваннямі архараў, дзікоў, ільвоў, грыфонаў і іншых жывёлін. Адначасова такія ж знаходкі адбыліся і на Паміры. Звяно, якога не хапала, было знойдзена.

Дзе ж усё-такі знаходзяцца вытокі гэтага мастацтва? Цяпер погляды вучоных усё часцей звяртаюцца на Пярэдні Усход. У старажытным пярэднеазіяцкім мастацтве заўсёды былі папулярныя адлюстраванні жывёл. Некаторыя з іх даволі блізкія да скіфскіх. Блізкія, але не тоесныя. Магчыма, скіфы ў час сваіх паходаў у Пярэднюю Азію пазнаёміліся з мастацтвам народаў, што насялялі яе, і пасля гэтага выпрацавалі свой самастойны стыль? Пакуль што гэта толькі меркаванні.

Есць і іншыя нявырашаныя пытанні. Сімволіка скіфскага мастацтва складаная і пакуль яшчэ для нас малазразумелая. Што таілася за падкрэсленай любоўю да паказу адных і тых жа звяроў у адных і тых жа позах? Ці было скіфскае мастацтва толькі дэкаратыўнае, а можа быць, яно мела яшчэ нейкае рэлігійна-містычнае значэнне?

Гэтага мы пакуль што не ведаем. Але можна не сумнявацца, што археалогія, якая адкрыла нам цудоўныя помнікі скіфскага мастацтва, адкажа і на гэтыя пытанні.

Анатоль ХАЗАНАЎ.
(АДН).

«СЛАЎНЫЯ ЛЮДЗІ, ГЭТЫЯ РУСКІЯ...»

Знаходка ў архіве венгерскага вучонага

Пажоўклы ад часу сшытак на 120 старонак. Ён знойдзены ў сямейным архіве вядомага венгерскага вучонага-славяназнаўцы акадэміка Оскара Ашбота. На вокладцы выведзена: «У Расіі», на першай старонцы дата: «21 чэрвеня 1882 года».

На працягу многіх месяцаў падарожжа па Расіі венгерскі вучоны запісваў у гэты сшытак свае назіранні і роздум з выпадку ўбачанага. «Прыемныя, слаўныя людзі, гэтыя рускія, мне вельмі падабаюцца, быццам я дома быў, так мне ўсё знаёмым здаецца, хоць і зусім новае для мяне...» — такі адзін з першых запісаў ў дзённіку Ашбота. У ім апісанні Масквы, Пецярбурга, Кіева, Ніжняга Ноўгарада, Нежына і іншых гарадоў. Пецярбург Ашбот называе «цудоўным горадам», а пра Маскву піша, што гэты горад «трэба ціха і сур'ёзна вывучыць», а потым: «Я сёння ўпершыню зразумеў, якую гордасць і радасць павінен адчуваць кожны сапраўдны рускі чалавек, калі аглядае Маскву».

Венгерскі вучоны захапляецца мастацтвам вялікай рускай драматычнай актрысы Глікерыі Фядотавай, карцінамі Траццякоўскай галерэі, архітэктурнымі ансамблямі Крамля, вуліц і плошчаў Пецярбурга і Кіева, рускім хорам пад кіраўніцтвам Славянскага. «Руская песня і рускі касцюм, рускія сарочкі мне падабаюцца, і мне балюча развітацца з гэтым светам». З вялікай паэтычнай сілай апісвае Ашбот прыгажосць рускай прыроды.

Гэтая цікавая знаходка зроблена ў Венгрыі дацэнтам Ужгарадскага універсітэта Якавам Штэрнбергам (вялікую дапамогу ўкраінскаму вучонаму аказаў венгерскі акадэмік Іштван Кніеж).

Фотакопія дзённіка Оскара Ашбота, расшыфраванага і падрыхтаванага да друку Я. Штэрнбергам, паступіла ў навуковыя фонды Ужгарадскага універсітэта.

Ул. ПАПОЎ,
карэспандэнт АДН.

КНІГІ ВЫЙШЛІ НА ПЛОШЧУ

Каля дваццаці столікаў выставілі ў нядзелю работнікі мінскіх кнігарань на Цэнтральнай плошчы сталіцы. Тут адбыўся кніжны базар, прысвечаны пачатку навучальнага года ў інстытутах, тэхнікумах, сярэдніх школах горада. Прадаваліся кнігі палітычнай, мастацкай, навуковай, сельскагаспадарчай, музычнай літаратуры.

Людна было каля ўсіх столікаў. Пакупнікі ахвотна набывалі вершы Я. Купалы, М. Танка, раманы І. Мележа, Ул. Карпава, І. Шамякіна. Прыкметна павялічыўся попыт на музычную літаратуру. Новымі песнямі беларускіх кампазітараў цікавяцца студэнты і вучні, хатнія гаспадыні і ваеннаслужачыя. Кампазітарам Я. Цікоцкаму і М. Аладаву прыходзіцца ўвесь час даваць аўтографы. Ды і не толькі рабіць надпісы, але і адказваць на пытанні: над якімі творамі працуюць цяпер, ці хутка яны выйдуць з друку.

Як і на мінулых кніжных базарах, гандлявалі ў асноўным грамадскія распаўсюджвальнікі кніг. Гэта дзяўчаты з розных прадпрыемстваў і устаноў горада. Яны добра вывучылі попыт аматараў літаратуры, і таму кнігі ў іх не затрымліваліся на століках.

На здымках: 1. На кніжным базары. 2. Аўтограф дае беларускі кампазітар Я. Цікоцкі.

Фота М. МІНКОВІЧА.

ІХ НОРАВЫ, ІХ МАРАЛЬ

Факты з зарубежных газет і часопісаў

«СТРАДЫВАРЫУС СЯРОД ВЕНТЫЛЯТАРАЎ»

Сімфанічны аркестр у Рычмандзе (штат Віргінія) правёў конкурс выканаўцаў з мэтай дадатковага адбору чатырох музыкантаў для выканання новага твора кампазітара Малькальма Арнальда. Гэты твор называецца «Вялікая сімфонія». Дадатковыя музыканты спатрэбіліся для партый... электрычнага вентылятара і палацёра. У выніку конкурсу лепшым музыкантам на вентылятары прызнаны нехта Жакаан Гальбрайт. Яго выкананне выклікала захапленне ва ўсіх членаў журы. Праз 45 мінут пасля ўключэння было прызнана, што вентылятар надзвычай музычны і дае чысты гук «рэ-бемоль». Аднак вентылятар быў вельмі стары, і некаторыя часткі яго крыху бразгаталі. Пасля таго, як іх змацавалі кавалкам вяровкі, журы аднадушна прызнала гэты вентылятар «Страдыварыусам сярод вентылятараў».

«Юманітэ».

КРЭМ СУПРАЦЬ ДЫСКРЫМІНАЦЫІ

Рад англійскіх і амерыканскіх фірм выпусцілі ў продаж навінку: крэм для скуры, які робіць скуру неграў і іншых чорнаскурых светлай. Шырока пастаўленая рэклама сцвярджае, што з дапамогай гэтага крэму можна лёгка вырашыць усе праблемы, звязаныя з расавай дыскрымінацыяй.

«Фолькссштыме».

Аддзел вядзе загадчык кафедры замежных моў Віцебскага медыцынскага інстытута Л. АБРАМЕНКА.

ПАКЛЁПНІК ПАКАРАНЫ

Маладая настаўніца матэматыкі Мігет Фабры, якая прымала ўдзел у конкурсе прыгажосці на тытул «Міс Францыі», распачала судовую справу супраць старшыні журы, паколькі той публічна заявіў, што надзвычай пышныя формы прэтэндэнткі на тытул «Міс Францыі» атрыманы не без дапамогі пракладак з порыстай гумы. Суддзі, асабіста пераканаўшыся ў непадробнасці ўсіх частак фігуры Мігет Фабры, прысудзілі паклёпніка да вялікага грашовага штрафу.

«Вохенпост».

ПАНІКА У КАЗІНО

Круп'е і ўладальнікі казіно ў Ла-Вегасе ахоплены панікай. Ла-Вегас — амерыканская Манака — славіцца сваімі карцёжнымі дамамі. Сюды з'язджаюцца аматары рулеткі з усіх канцоў Амерыкі. Зараз колькасць кліентаў карцёжных дамоў павялічылася: каля пяці тысяч тэхнікаў і праграмістаў з вылічальнага цэнтра з дня на дзень сядзяць у ігральных залах, імкнучыся зразумець усе тонкасці гульні ў рулетку. Гэта патрэбна для навуковых даследаванняў. З дапамогай электроннага мозгу мяркуецца стварыць «бяспройгрышную сістэму» гульні ў рулетку.

«Фолькссштыме».

ДЫПЛАМАВАНЫЯ ЧЫСЦІЛЬШЧЫКІ

Студэнцкае аб'яднанне ў Мюнхене прымае па тэлефоне заказы на прыбіранне кватэр, выбіванне дываноў і іншыя работы. У апошні час уведзена новая форма абслугоўвання кліентаў: чыстка абутку на даму. Па тэлефоннаму званку студэнт са скрынкай для ваксавання абутку з'яўляецца на кватэру кліента і наводзіць бляск на яго абутак. Колькасць такіх заказаў даволі значная, бо многім падабаецца, каб іх абутак ваксаваў не звычайны чысцільшчык, а без пяці мінут уладальнік дыплома.

«Фолькссштыме».

ЯНКІ У ЗАХОДНЯЙ ГЕРМАНІІ

З 1945 года ў Заходняй Германіі амерыканскімі ваеннаслужачымі з мэтай абрабавання забіта больш двухсот шафёраў таксі. Колькасць забойстваў, грабяжоў і іншых злачынстваў, здзейсненых амерыканцамі ў Германіі, значна вышэйшая за колькасць злачынстваў, што зрабілі столькі ж амерыканцаў у сябе дома. 86 працэнтаў усіх злачынстваў, зробленых ваеннаслужачымі, прыпадае на долю салдат і афіцэраў ва ўзросце ад 18 да 21 года.

«Оувесіз віклі».

«ПАЖАДАЛІ ЗАСТАЦЦА НЕВЯДОМЫМІ»

У Італіі сталі частыя крадзяжы твораў мастацтва. На працягу шасці з палавінаю гадоў, асабліва ў апошні час, з цэркваў, музеяў і прыватных калекцый было ўкрадзена 680 твораў мастацтва, сярод якіх некалькі карцін майстроў школы Караваджа, дзве карціны аднаго з вучняў Тыцыяна, «Расстрэл» Гоі, «Сусанна і старыя» Якапа Басана, «Нараджэнне Хрыста» Гвардзі, палотны-ілюстрацыі да «Вызваленага Іерусаліма» аднаго з майстроў Карачы і іншыя. Міністэрства асветы Італіі і Вышэйшы савет па пытаннях помнікаў старажытнасці і прыгожых мастацтваў апублікавалі доўгі спіс украдзеных шэдэўраў.

Першы быў абрабаваны сабор горада Гарыцыя, адкуль укралі унікальныя антычныя бюсты з пазалочанага серабра, епіскапскі кій работы майстроў XIII стагоддзя, інкруставаны горным крышталем, два кії з пазалочанага серабра, а з алтара зладзеі захапілі прадметы культу, якімі карыстаецца папа Рымскі, калі ён праводзіць набажэнства ў гэтым саборы.

Гэты крадзеж паклаў пачатак цэлай серыі выкраданняў твораў мастацтва з дзяржаўных і прыватных калекцый Італіі.

Праз некалькі месяцаў, калі яшчэ ішло расследаванне гэтага выпадку і вызначаліся памеры нанесенай шкоды, у другім італьянскім горадзе — Пістоје — з царквы знікла карціна, на залатым фоне якой намалявана «Мадонна з дзіцем», работы невядомага майстра 1367 года. А яшчэ праз тры дні з Веронскага музея «Касцёлвек'ё» была ўкрадзена карціна, напісаная, як відаць, славутым Бернардо Дадзі.

У далейшым, пачынаючы з 1957 года, дзейнасць «аматараў мастацтва, якія пажадалі застацца невядомымі», набыла рэгулярны характар, нягледзячы на тое, што іх пошукамі займаліся італьянская паліцыя, жандармерыя і нават Інтэрпал (міжнароднае паліцэйскае аб'яднанне па адшуканню крымінальных злачынцаў).

Калі меркаваць па значнасці ўкрадзеных шэдэўраў жывапісу, дык трэба сказаць, што зладзеі не пазбаўлены мастацкага густу.

В. ПАПОЎ.
(ТАСС).

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, Г. М. БУРАЎКІН, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, В. Б. ЛАДЫГІНА, П. М. МАКАЛЬ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ (адказны сакратар), Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), І. А. САНКОВА, З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

Калектыў Міністэрства культуры БССР глыбока смуткуе з прычыны смерці намесніка начальніка адміністрацыйна-гаспадарчага аддзела міністэрства А. А. Карчэўскага і выказвае спачуванне сям'і памёршага.

ТЭЛЕБАЧАННЕ

8 верасня

Першая праграма. 11.00 — дакументальны фільм «Гэта пачыналася так». 11.20 — мастацкі фільм «Шлях да прычала». 16.15 — праграма перадач. 16.20 — для школьнікаў. «Наша газета». Перадача з Ленінграда. 17.20 — «Наш прэсцэнтр». «У нас у гасцях журналісты-міжнароднікі» (М). 18.00 — для акцябрат. «Зорачка». Тэлечасопіс. 18.30 — тэлевізійныя навіны. 18.50 — кінанарыс «Два дні ў Непале». 19.00 — паўфінал кубка па футболу (М). 20.45 — тэлевізійныя навіны (М). 21.30 — «Журналіст і час». Гутарка старшыні бюро Мінскага гарадскога аддзялення Саюза журналістаў БССР В. Самуціна. 21.45 — «Фізкультура і спорт». 22.05 — «У нас у гасцях — заслужаны артыст РСФСР Ляонаў». (У запісе на відзеамагнітафон).

Другая праграма. 12.00 — «Будзь шчаслівая, Ані». Мастацкі фільм (М). 18.00 — тэлевізійныя навіны (М). 18.10 — тэлевізійны эканамічны веснік (М). 19.00 — «У мёртвай пятлі». Мастацкі фільм. 20.45 — тэлевізійныя навіны (М). 21.35 — Б. Рымар. «Шукаю Іванова». Прэм'ера тэлеспектакля (М).

9 верасня

Першая праграма. 10.00 — парад, прысвечаны 20-годдзю з дня звяржэння фашысцкай дыктатуры ў Балгарыі. Перадача з Сафіі. 11.00 — мастацкі фільм. «У мёртвай пятлі». 15.40 — праграма перадач. 15.45 — для школьнікаў. «Свабоднай Балгарыі — 20 год». «Нашы сябры — піянеры Балгарыі» (М). 17.30 — для школьнікаў. Кіначасопіс «Піянерыя» № 6. 17.40 — навукова-папулярны фільм «У тропіках Атлантыкі». 18.00 — тэлевізійныя навіны. 18.10— свет сёння (М). 18.50 — для дзяцей. «У балгарскіх школьнікаў». 19.10 — «Да сяброў у Балгарыю». Кінанарыс. 19.30 — «Зямля красы юначай». Літаратурная перадача да 20-годдзя звяржэння фашысцкай дыктатуры ў Балгарыі. 19.55 — балгарскі мастацкі фільм «Дом на дзве вуліцы». 21.15— «Інфармацыя на службе навукі і тэхнікі». Гутарка супрацоўніка Усесаюзнага інстытута навуковай і тэхнічнай інфармацыі І. І. Асафрэй. 21.30— тэлевізійныя навіны (М). 22.00 — святочны канцэрт. Перадача з Сафіі.

Другая праграма. 17.30 — для дашкольнікаў і малодшых школьнікаў. «Парады гэтыя памятайце, дзеці». (М). 18.00 — тэлевізійныя навіны (М). 18.10 — «Праз дзесяць год». Тэлефільм. 18.40 — «Агні, якія сцерагуць». Кінанарыс. 18.50 — свабоднай Балгарыі — 20 год. «Расказы аб граніце». Прэм'ера тэлевізійнага фільма (М). 20.00 — «На форум, юнацтва!» Рэпартаж з Дома дружбы (М).

10 верасня

Першая праграма. 16.55 — праграма перадач. 17.00—для дзяцей. Мультфільм «Каштанка». 17.30 — «Калі ўрокі зроблены». Перадача з Палаца піянераў (М). 18.00 — тэлевізійныя навіны. 18.20 — для веруючых і няверуючых. «Хто і як секты ствараў». Гутарка журналіста М. Цімошыка. 18.40 — мастацкі фільм «Артыст з Коханаўкі». 19.55 — канцэрт. 21.00— дакументальныя фільмы «Шлях юнацтва». «Цябе чакае нафта». 21.30 — эстафета навін (М).

Другая праграма. 16.55 — праграма перадач (М). 17.00 — для школьнікаў. «Толькі ўмелым пакараецца зямля». Тэленарыс аб юных хлебаробах (М). 17.30 — «Рэспубліка хіміі». Кінанарыс. 18.00 — тэлевізійныя навіны (М). 18.10 — «На палях краіны» (М). 19.00 — мастацкі фільм «Бухта Алены» (М). 20.15 — «На прасторах Радзімы» (М). 20.30 — «На форум, юнацтва!» (М). 21.00 — для юнацтва. «Крылы над Арктыкай» (М).

«Літаратура і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19. Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-44-04, аддзела літаратуры — 3-21-53, аддзела мастацтва — 3-24-62, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-44-04, выдавецтва — 3-19-52, бухгалтэрыі — 3-11-03.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Індэкс 63856. Друкарня выдавецтва «Звязда». АТ 03084.